№ 11 (513) 30 сакавіка 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## У НУМАРЫ

**Сьмерць на чужыне**

Адзінаццаць беларускіх авіятараў загінулі ў Самалі. **Старонка 12.**

**Расейская мазута ў беларускай рацэ**

Экалягічная катастрофа на Уле. **Старонка 13.**

**Крысьціна Шацікава пра жахі вар'ятні**

Магілёўскую дысыдэнтку спрабавалі адправіць у псыхіятрычную больніцу. **Старонка 13.**

**Эўропа як Беларусь**

Праз 50 год пасьля заснаваньня Эўразьвяз зрабіўся востравам стабільнасьці, аднак пакрысе пачынае спаўзаць у абыякавасьць. З Брусэлю піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 22.**

**Гастролі коласаўцаў у сталіцы**

Віцебскі тэатар прывёз «Сон на кургане» і «Бацьку». **Старонка 30.**

**Газэтка дзеткам**

Падводныя прыгоды-2. **Старонка 29.**

# Дзень Волі 2007




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Рэпартаж, вынікі, камэнтары. Старонкі 2—11, 16—21.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Дамова, якая ікнецца

Беларусь адкрывае свой рынак для расейскіх тавараў дзеля атрыманьня танных энэрганосьбітаў. Пра дамову, падпісаную Сідорскім і Фрадковым 23 сакавіка, — **старонка 14.**


АРЦЕМ ЛЯВА

# Сталіца ў кальцы маніфэстацый

Ужо сталася традыцыяй, што акцыі на Дзень Волі зьбіраюць на менскіх вуліцах найбольшую колькасьць людзей. Гэты год ня стаў выняткам. Колькасьць тых, хто ўдзельнічаў у маніфэстацыях 25-га ў сталіцы, можна ацаніць ня менш як у 10—15 тысяч чалавек. Вызначыць дакладную колькасьць немагчыма, бо групы людзей падступалі да Кастрычніцкай плошчы з розных бакоў, калёны прыходзілі да Акадэміі навук зь вялікай розьніцай у часе.

Варта адзначыць, што ўпершыню ў Менску Дзень Волі быў адзначаны акурат 20 гадоў таму, у 1987 г. Сёлета было 20-е сьвяткаваньне.

## Не працавалі мабільнікі і сайты

Раніца пачалася з таго, што ў Беларусі перасталі адчыняцца незалежныя інфармацыйныя сайты: «Нашай Нівы», радыё «Свабода», «Хартыі-97», «Эўрарадыё», сайт Мілінкевіча. Тамсама быў заблякаваны цалкам livejournal, які ў адсутнасьці пэрыядычнай працы сайтаў мог бы стаць крыніцай альтэрнатыўнай інфармацыі, як было летась падчас прэзыдэнцкіх выбараў і падзеяў на Плошчы.

Аб 11:00, едучы «соткай» праз Кастрычніцкую плошчу, заўважаю, што на ёй не працуе мабільная сувязь. На Плошчы абсалютна няма людзей, калі ня браць у разьлік супрацоўнікаў міліцыі і АМАПу. Тамсама стаяць аўтазакі. Міліцыянты разьмешчаныя на ўсіх падступах да Плошчы. Перакрытыя вуліцы Інтэрнацыянальная, Маркса, Пляц Волі, Леніна. Бліжэй да 12 гадзіны аўтобусы перасталі спыняцца на прамежку між вуліцай Казлова і Плошчай Незалежнасьці.

Праз тое, што людзей не пускаюць на Плошчу, фактычна ўтварылася некалькі груп тых, хто прыйшоў на мітынг. Першая сьцякалася да цырку, другая — да ГУМу з боку праспэкту, трэцяя — да плошчы Свабоды ад Нямігі.

## Ля цырку кіраваў Паўлічэнка

Ля цырку ўжо а 12-й гадзіне згуртавалася больш за тысячу чалавек. Некаторыя выказвалі думку пайсьці Інтэрнацыянальнай у бок Макдоналдзу, каб злучыцца зь людзьмі, што стаяць там. Спрабавалі — усё перакрыта. У натоўпе лю-

### У Берасьці сьвяточны пікнік

Упершыню за апошнія гады прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Берасьця супольна адзначалі Дзень Волі. Хоць шмат берасьцейскіх актывістаў паехала ў гэты дзень у Менск, удзел у сьвяточных мерапрыемствах узялі семдзесят чалавек.

У трох мікрараёнах гораду актывісты раздавалі віншаваньні з нагоды сьвята ад імя Партыі БНФ і бюлетэнь БСДП.

А 14.00 пачаўся футбольны турнір з удзелам камандаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі, БСДП, Партыі БНФ, Партыі камуністаў. Перамаглі сацыял–дэмакраты. Турнір праходзіў пад пільным наглядам міліцыі.

Скончылася сьвяткаваньне традыцыйным пікнікам у лесе.

### У Івянцы спэцслужбіст распранаў вучняў

У Івянецкай школе за месяц перад 25 Сакавіка дырэктар, сацыяльны пэдагог, завуч нагадвалі дзецям, што ў нядзелю яны мусяць быць дома, ня ехаць у Менск на акцыю, каб «не пакалечыць сабе жыцьцё». А ў пятніцу з Валожына прыехаў прадстаўнік «органаў» і сустрэўся з старшаклясьнікамі. Падчас сустрэчы дзяцей прымушалі... распранацца, каб паглядзець, якія на іх саколкі, ці не з нацыянальнай сымболікай. За значкі ж увесь час палохаюць пастаноўкай на міліцэйскі ўлік.

дзям раздавалі бел-чырвона-белыя сьцяжкі, балёнікі, хустачкі. У знак салідарнасьці сыгналілі аўтамабілісты.

Калі а 12.30 з боку вуліцы Янкі Купалы пачаў націскаць падвойны шэраг спэцназаўцаў, людзі зразумелі, што на Плошчу патрапіць ня ўдасца і скіраваліся ў бок плошчы Перамогі. У калёне ішло шмат дзеячоў культуры і грамадзтва. Большая частка людзей ішла з таго боку праспэкту, на якім цырк.

На падыходах да плошчы Перамогі перад людзьмі выступіў лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Ён паведаміў праз мэгафон, што ўлады парушылі папярэднюю дамову пра магчымасьць збору каля Макдоналдзу і праходу да Акадэміі навук. Заклікаў людзей рухацца паволі, каб маглі далучыцца іншыя калёны, якія, зь ягоных словаў, рухаліся адна па Нямізе і другая па вуліцы Багдановіча.

Частку людзей ад Плошчы ўдалося адсекчы і скіраваць у бок дому-музэю РСДРП на вуліцу Камуністычную. Кіраваў гэтым усім асабіста Дзьмітры Паўлічэнка ў крапавым бэрэце.

У астатнім гэтая частка дэманстрантаў дабралася да Акадэміі навук без асаблівых прыгодаў. Рухаючыся, калёна няспынна расла. Напачатку, ля плошчы Перамогі, у ёй было каля 6—7 тысяч чалавек. З бальконаў і вокнаў мітынгоўцаў віталі жыхары сталіцы. Так, насупраць заводу «Белвар» у доме на пятым паверсе адзін чалавек, ня маючы бел-чырвона-белага сьцягу, апрануў чырвоны швэдар і трымаў за сьпінай белую прасьціну. Маніфэстанты яго віталі, жонка з кватэры ганіла, ён ад яе адмахваўся. Людзі сьмяяліся.

На плошчы Якуба Коласа ў адным з вокнаў вывесілі вялікі бел-чырвона-белы сьцяг.

## Павадзілі па горадзе і загналі ў мэтро

З боку ГУМу людзі паводзілі сябе актыўней, скандавалі лёзунгі, сьпявалі песьні. Тутака сярод публікі было шмат палітыкаў. Некаторыя паспрабавалі прарвацца на Плошчу. Дзе там! Усё надзейна было перакрыта «чорнымі». Разам зь людзьмі знаходзіўся і лідэр апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч.

Спэцназ пачынае выцясьняць людзей далей ад Плошчы. Насупраць будынку КДБ калёна спыняецца, некаторыя залазяць на прыступкі «жоўтага будынку». Падалося, што тут можа пачацца нейкі мітынг. Не даюць, працягваюць выцясьняць. Выцісьненьне людзей нагадала акцыю 19 сакавіка. Відаць, ужо тады адпрацоўвалі такі мэханізм змаганьня з апазыцыйнымі пратэстамі.

Працяг на старонцы 4.



WWW.NAVINY.BY

**На Кастрычніцкую плошчу ў Дзень Волі пускалі толькі людзей зь білетамі на «Лебядзінае возера».**



АРЦЁМ ЛЯВА

**З боку цырку Плошчу ахоўвалі байцы Дзьмітрыя Паўлічэнкі.**

У нядзелю усе старшаклясьнікі мусілі пазваніць кляснаму кіраўніку, засьведчыць, што яны ў Івянцы ды распавесьці пра пляны на дзень.

### Колькі трэцяклясьнікаў было на Дні Волі?

У Вялейцы адміністрацыя школы ў пятніцу патрабавала ад клясных кіраўнікоў тлумачэньняў па кожным з адсутных вучняў, у тым ліку з малодшых клясаў. Настаўнікі рагочуць.

### На дыскатэку 25 Сакавіка пад прымусам

У Ліцэі №3, што ў Дражні, усіх навучэнцаў прымусілі падпісацца пад паперай, якая іх абавязвае наведаць дыскатэку, арганізаваную БРСМ у гонар Дня Незалежнасьці. Наведваньне дыскатэкі было арганізаваным. Першая група навучэнцаў мусіла быць там з 11 да 15, другая — танчыла з 15 да 19. Школьнікі кажуць, што тое самае адбывалася і ў іншых школах.

### У Сьветлагорску ўскладалі кветкі

Прадстаўнікі грамадзкасьці і група моладзі ўсклалі кветкі да крыжа памяці ахвяраў таталітарных рэпрэсіяў і да помніка Раману Шацілу, заснавальніку паселішча. За акцыяй назіралі міліцыянты ў цывільным і вялі відэаздымкі. Моладзь прыбрала каля крыжа

Напярэдадні ў горадзе і раёне былі распаўсюджаныя некалькі тысячаў улётак аб сутнасьці Дня Волі. З 24 сакавіка на інфармацыйных тумбах і стэндах у горадзе вывешаныя плякаты «25 Сакавіка – Дзень Волі, 89 гадавіна Беларускай Народнай Рэспублікі».

### У Горадні каля Каложы

Гарадзенскія актывісты ўскладалі кветкі да знаку «На Грунвальд», што побач з Каложай. Мікола Воран апавядаў усім гісторыю тагачасных падзеяў. Ушанавалі памяць загінулых за Беларусь хвілінай маўчаньня й скіраваліся да Старога й Новага замкаў, дзе таксама ўшанавалі памяць загінулых за Беларусь побач з помнікам Вітаўту.

### З Вузды ехалі на Менск

Раніцай на 25 Сакавіка на выезьдзе з Вузды затрыманы аўтамабіль сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Віктара Крываля. На трасах у Менск правяралі аўтобусы: на асноўных дарогах Менскага раёну ад раніцы курсавалі мікрааўтобусы з супрацоўнікамі ДАІ. Разам зь імі знаходзяцца і людзі ў цывільным.



На праспэкце Скарыны.

АРЦЁМ ЛЯВА

# Сталіца ў кальцы маніфэстацый

**Працяг са старонкі 3.**

Людзей не пускаюць на другі бок праспэкту, а таксама да плошчы Незалежнасьці, выцясьняюць на Гарадзкі Вал. Ля вуліцы Інтэрнацыянальнай пачаліся сутычкі з АМАПам. Мілінкевіча штурханулі так, што ён паваліўся, у Іны Кулей, якая адбівала затрыманых, параненая рука.

Людзей выцясьняюць на Нямігу, а адтуль — на праспэкт Машэрава. Акурат тады калёна і набрала найбольшую магутнасьць, у ёй было 3—4 тысячы чалавек.

Ужо калі людзі падыходзілі да Палацу спорту, на праспэкце пачалі езьдзіць міліцэйскія машыны і папярэджваць, што акцыя несанкцыянаваная і супраць яе ўдзельнікаў можа быць ужытая фізычная сіла і адміністрацыйнае пакараньне. Далей калёну ўжо не прапускалі. Відаць, забаяліся, каб не пайшлі на Дразды.

Праспэкт быў перакрыты абапал. Вольна можна было заходзіць толькі ў двары, што людзі і зрабілі, але ня ўсе. Супраць тых, хто супраціўляўся, былі ўжытыя дубінкі. У дварах на Мельнікайтэ спэцназаўцам удалося разьбіць калёну на меншыя групкі.

Частку мітынгоўцаў міліцыянты «ветліва» загналі ў мэтро на станцы «Фрунзэнская». Значная група людзей, даехаўшы да «Першамайскай», змагла зноў арганізавацца і рушыла ўжо бяз значных прыгод да Акадэміі навук. Пазьней да гэтай калёны зноў далучыўся Мілінкевіч, ён жа яе і ўзначаліў.

## «Разносьце ўлёткі»

Пляцоўка ля Акадэміі навук была амаль цалкам запоўненая. Гучала музыка, людзі размаўлялі між сабой, знаёміліся, праходзіў запіс у рух «За Свабоду», нейкі хлопец ляпаў па вядры, як у бубны. На пляцоўцы было багата — сотні — бел-чырвона-белых сьцягоў, расьцяжак. Быў нават адзін чырвона-зялёны сьцяг, на якім было напісана «За гонар, свабоду і справядлівасьць». Усе чакалі, калі падыдзе калёна зь Мілінкевічам.

Дзьве калёны злучыліся ля Акадэміі навук дзесьці а 14:10. Людзі адразу пачалі скандаваць «Мілінкевіч! Мілінкевіч!». Для лідэра апазыцыі ўтварылі жывы калідор, ён прайшоў на верхнія прыступкі Акадэміі, стаў у цэнтры.

Вёў мітынг лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Было багата выступоўцаў, як беларусаў, так і замежнікаў. Аднак мала хто запомніўся. Віцэ-прэзыдэнт Эўрапарлямэнту Януш Анышкевіч, прамаўляючы па-польску, ска-

**Крычаў: урачыстая вечарына**

У Крычаве прайшла ўрачыстая вечарына, прымеркаваная да Дня Волі. Напярэдадні выйшаў сьвяточны нумар крычаўскай газэты «Вольны горад». Рэдактара выданьня перад 25 Сакавіка выклікалі да пракурора раёну, які папярэдзіў пра адказнасьць за несанкцыянаваныя публічныя мерапрыемствы.

**Магілёў: вечарына і дніна**

Падчас урачыстае вечарыны гісторык Ігар Пушкін распавёў грамадзе пра падзеі, якія адбываліся ў Магілёве ў 1917, 1918 г. Арганізавала сустрэчу гарадзкая суполка Таварыства Беларускай Мовы.

Грамадзкія й партыйныя актывісты выйшлі на цэнтральныя вуліцы гораду зь бел–чырвона–белымі шалікамі. Яны распаўсюджвалі зварот старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы да грамадзянаў Беларусі, а таксама паштоўкі да Дня Волі.

Міліцыянты ж праз пагрозы адміністрацыйным пакараньнем перапынілі стыхійны мітынг. Ён пачаўся на Савецкай плошчы перад будынкам мясцовага краязнаўчага музэю. Моладзь прыйшла да музэю, каб ускласьці кветкі і ўшанаваць магілёўцаў, якія 12 ліпеня 1918 г. ухвалілі абвяшчэньне БНР.

У прылеглых дварах стаялі напагатове машыны са спэцназаўцамі.

**Горкі: распаўсюд паштовак**

У Горках грамадзкія актывісты Дзень

заў, што Беларусь — гэта апошняя краіна Эўропы, дзе няма вольнасьці, а ёсьць аўтарытарызм. Юлія Казуліна нагадала, што акурат год таму арыштавалі яе бацьку Аляксандра Казуліна, які і цяпер за кратамі. Прапанову старшыні Рады беларускай інтэлігенцыі Уладзімера Коласа ўсім аб’яднацца, каб разам пайсьці на Кангрэс, людзі сустрэлі вяла.

Большасьць адкрыта чакала, калі свой выступ пачне Мілінкевіч. Ён выступаў апошнім. Мілінкевіч сказаў пра сымбалічнасьць таго, што ў адзін дзень сьвяткуецца і 50-годзьдзе Эўрасаюзу і беларускі Дзень Волі. Мілінкевіч сказаў, што яму сёньня тэлефанавалі з канцылярыі Ангелы Мэркель і выказалі падтрымку ў змаганьні беларусаў за дэмакратыю. Лідэр апазыцыі адказаў на пытаньне, што трэба рабіць пасьля 25 Сакавіка. На ягоную думку, найважнейшым зьяўляецца распаўсюд незалежнай інфармацыі: «Вы пытаецеся, што рабіць пасьля. Паверце, працы хопіць для ўсіх. Не чакайце нейкіх установак зьверху, шукайце і распаўсюджвайце ўлёткі, капіюйце газэты і кніжкі, давайце чытаць іх сваім знаёмым і суседзям». Мілінкевіч таксама заклікаў маладых не ўступаць у БРСМ. Рэакцыя была вельмі жвавай.

Увесь час, пакуль доўжыўся мітынг, вакол людзей езьдзіла міліцэйская машына, праз гукаўзмацняльнік па-беларуску паведамлялася, што гэтая акцыя несанкцыянаваная і далей па тэксьце пра фізычную сілу і спэцсродкі.

Вінцук Вячорка пры канцы мітынгу яшчэ запытаўся ў людзей, ці ня хочуць яны пайсьці шэсьцем на плошчу Бангалор. Адказ быў катэгарычна адмоўным.

Мітынг скончыўся гімнам «Магутны Божа».

## Людзей палівалі вадой

Па сканчэньні мітынгу частка людзей рушыла ў бок Нацыянальнай бібліятэкі, каб далучыцца да людзей, што былі на канцэрце БРСМ «За незалежную Беларусь». Рух дэманстрантаў увесь час прыпыняўся спэцназаўцамі, якія блякавалі падыходы да бібліятэкі, патрабуючы ісьці ў адваротным кірунку. Праспэктам праехала колькі аўтазакаў, а таксама машыны з байцамі Паўлічэнкі з в/ч 3214. Усё ж людзям неяк удалося дамовіцца зь міліцыянтамі і працягнуць рух.

А палове на пятую людзі дайшлі да Нацыянальнай бібліятэкі. Сьвяточны канцэрт вымушаны быў тэрмінова згарнуцца за дзесяць хвілінаў да гэтага. Маладзёны пачалі разгортваць ля бібліятэкі бел-чырвона-белыя сьцягі. АМАП запатрабаваў вызваліць пляцоўку. Прыехалі камунальныя машыны, якія спрабавалі паліваць людзей вадой. Людзі разьбягаліся. Такога беларускія ўлады супраць апазыцыянэраў, здаецца, яшчэ не выкарыстоўвалі.

Праўда, усіх затрыманых неўзабаве выпускалі.

Разгону не адбылося, магчыма, дзякуючы таму, што на заклік Мілінкевіча адгукнуліся шэраг эўрапейскіх палітыкаў. Што праўда, і адзначыць сьвята як сьлед улада не дала. Віцэ-сьпікер Эўрапарлямэнту Януш Анышкевіч мяркуе, што такія паводзіны ўладаў ня будуць спрыяць паляпшэньню адносінаў паміж Беларусьсю і Эўропай.

**Зьміцер Панкавец**


Юлія Дарашкевіч

Ад бібліятэкі пратэстоўцаў адганялі палівальнымі машынамі.

Волі адзначалі распаўсюдам паштовак з нацыянальнай сымболікай. Напярэдадні Дня Волі выйшаў сьвяточны нумар горацкай газэты «Ўзгорак».

### Гомель: На бальконе сьцяг

У Гомелі на бальконе шматпавярховага дому на вул.Царыкава чатыры гадзіны вісеў нацыянальны сьцяг. Яго вывесіў рабочы й прыхільнік беларушчыны Іван Адаменка — так ён адзначыў Дзень Волі.

### КХП-БНФ ускладала кветкі

Сябры КХП–БНФ зладзілі альтэрнатыўнае сьвяткаваньне Дня Волі. А 12.00 каля ста актывістаў партыі сабраліся ў сквэры насупраць Опэры. Людзі ўсклалі кветкі да помніка Багдановічу. Выступіў Сяргей Папкоў. На пачатку хвілінай маўчаньня ўдзельнікі памянулі беларускіх авіятараў, якія загінулі заўчора ў Самалі. Людзі заслухалі ў запісе выступ Зянона Пазьняка.

Пасьля грамада прайшла да плошчы Якуба Коласа, усклала кветкі да помніка песьняру. Завяршылася мерапрыемства на Вайсковых могілках, ля магіл Янкі Купалы і Якуба Коласа.

### Прэмія Партыі БНФ

Падчас сьвяточнага мітынгу 25 Сакавіка Вінцук Вячорка назваў ляўрэатаў новазаснаванай прэміі Партыі БНФ. Па выніках 2006 г. у намінацыі «Грамадзкая чыннасьць» ляўрэатам стаў Павал Севярынец (за палітычную дзейнасьць і публіцыстыку). У намінацыі «Культура» перамог лідэр гурту «Стары Ольса» Зьміцер Сасноўскі (за аднаўленьне гістарычнай спадчыны). А ў намінацыі «Адукацыя й навука» — Зьміцер Колас (за выданьне беларуска–ангельскага й беларуска–нямецкага слоўнікаў). Адмысловай прэміяй пасьмяротна ўганараваны Валер Дашкевіч (за аналітычныя працы па палітыцы й эканоміцы).

*ВМ, Івянец; АЛ, Менск; Тэльман Масьлюкоў, Сьветлагорск; Прысутная, Вялейка; Алесь Асіпцоў, Магілёў; Дзедзіч, Берасьце; Сямён Печанко; таксама інф. радыё «Свабода»*



АРЦЁМ ЛЯВА

**Праспэкт Скарыны. Жыхары сталіцы вітаюць маніфэстантаў, якія скіраваліся да Нацыянальнай бібліятэкі.**

# Віцебск: Мірон і 18 затрыманых

Плошча Свабоды ў Віцебску, як і напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, была застаўлена тэхнікай. Бо менавіта на плошчу дэмакраты Віцебску запрашалі людзей адсьвяткаваць Дзень Незалежнасьці.

Агулам на Дзень Волі ў Віцебску затрымалі 18 чалавек, зь іх пяцёра непаўналетнія. У ізалятары часовага ўтрыманьня правялі ноч сябры КХП-БНФ Ян Таўпыга, Ян Дзяржаўцаў, Алесь Пазьняк і адзін з найстарэйшых віцебскіх апазыцыянэраў Барыс Хамайда. Іх затрымалі зь бел-чырвона-белымі сьцягамі. Іншых адпусьцілі, па непаўналетніх прыехалі сваякі.

Пратаколы за ўдзел у несанкцыянаваных масавых акцыях склалі на дванаццаць чалавек.

Затрыманыя меркавалі прайсьці вуліцай Леніна да помніка Караткевічу, каб ускласьці кветкі. Двойчы міліцыянты перапынялі рух актывістаў, якія ішлі парамі па ходніках, і адвозілі некалькі чалавек у пастарунак.

Да помніка земляку віцьбічы трапілі толькі каля 16-й гадзіны — калі іх выпусьцілі з райаддзелу.

А каля 9-й вечара нацыянальны сьцяг залунаў над «Духаўскім круглікам» — цаглянай вежай, якую адбудоўваюць паводле гістарычных дакумэнтаў.

Сьцяг міліцыянты здымалі на вачох у мінакоў з дапамогаю супрацоўнікаў Міністэрства надзвычайных сытуацыяў. Ня меншы інтарэс жыхароў Віцебску выклікала тое, што надзьмутыя балёнікі, прымацаваныя да сьцяга, міліцыянты расстралялі з пнэўматычных пісталетаў.

**Кастусь Смолікаў, Віцебск; інф. радыё «Свабода»**

# «Залатая літара» ў вузкім коле

У 2006 г. найлепшай кнігаю, на думку Глёбуса, стаў «Беларускі эратычны фальклёр». Атрымліваецца, што трэ было даваць прэмію беларускаму народу. А паколькі, паводле апытаньняў «НН», сама варты званьня «народнага пісьменніка» — Уладзімер Арлоў, то «Залатую літару 2006» атрымаў за народ ён. Пагатоў, як тлумачыць сам Глёбус, леташнюю кнігу вершаў Арлова «Паром праз Ля-Манш», ён прачытаў з прыемнасьцю. Такім чынам, адной прэміяй былі ўганараваныя і народ, і паэт.

Цырымонія ўручэньня 111 эўра (такі памер прэміі «Залатая літара») мелася адбыцца ў кавярні «Стары Менск». На жаль, кавярня тая была зачыненая з нагоды маніфэстацыі на Дзень Волі. Пасьля кароткай цырымоніі ўручэньня ў вузкім коле, пісьменьнікі зь сябрамі далучыліся да калёны дэманстрантаў. А кавярні, крамы й «Макдоналдз», што месьцяцца на галоўным праспэкце сталіцы, засталіся без нядзельнага прыбытку.

**СХ**

### Пецярбург: на Ісакіеўскай плошчы

А 14 гадзіне па расійскім часе пачаўся, а а 16-й скончыўся сход беларускай грамадзкасьці Санкт-Пецярбургу. Сход праходзіў у будынку Новага дому культуры на Ісакіеўскай плошчы. З дакладам выступіў прафэсар, доктар культуралёгіі, мянчук Валянцін Грыцкевіч, у спрэчках прынялі ўдзел палкоўнік Аляксандар Станкевіч з Крывічоў, капітан другога рангу Міхаіл Прахорчык з Салігорску, Маргарыта Пярова, унучатая пляменьніца Антона Луцкевіча.

**Мікола Нікалаеў**

### Віншаваньне з Днём Волі ад моладзевага руху Амэрыкі

Ад імя Беларускага Моладзевага Руху Амэрыкі віншуем усіх суайчыньнікаў зь вялікім нацыянальным сьвятам 25 Сакавіка — Днём Волі! 25 Сакавіка зьяўляецца для беларусаў знакавай, вызначальнай датай XX ст. і ў цэлым ва ўсёй гісторыі Беларускай нацыі. Нічога няма важнейшага ў жыцьці нацыі за дасягненьне ёю незалежнасьці і стварэньне нацыянальнай дзяржавы. Такая падзея ўваходзіць у вечнасьць. Яна грунт, на якім стаім, і пуцяводная зорка, па якой ідзём.

Нават цяпер пры антыбеларускім рэжыме і рэпрэсіўнай палітыцы, пэрспэктыву нашага нацыянальнага існаваньня зьберагае нам наша дзяржаўная незалежнасьць. Беражэм яе як агульнае дасягненьне, як найвялікшую каштоўнасьць і найвялікшую заваёву народа.

Жыве Беларусь!

### Бэрлін: Дзень Волі-Live

25 Сакавіка ў нямецкай сталіцы працавала незалежнае беларускае інфармацыйнае бюро. Група нямецкіх актывістаў — сяброў Беларусі — трансьлявала рэпартаж пра Дзень Волі па-нямецку ў рэжыме рэальнага часу. Тэксты рэпартажу складаліся па жывой сувязі з удзельнікамі пратэстаў. Акцыя праводзілася пры падтрымцы Нямецка-беларускага таварыства і Школы кіраваньня Hertie.

**АК, Брусэль**

### Лыжныя гонкі ў Кіеве

У Кіеве, на самым Хрышчаціку, адбыўся пэрформанс «Кубак Лукашэнкі ў бегу на лыжах па асфальту». Арганізоўвалі яго незалежныя грамадзкія актывісты – удзельнікі кампаніі «Беларуская вясна». Паўтара дзясяткі чалавек удзельнічалі ў трох 100-мэтровых забегах.

### У Лёндане экумэнічная імша

У Лёндане найстарэйшая беларуская арганізацыя, Згуртаваньне беларусаў Вялікабрытаніі, наладзіла экумэнічнае

# Не «Тяні»

Пяць рок-гуртоў адмовіліся ад удзелу ў БРСМ-аўскім канцэрце «За незалежную Беларусь».

Паралельна з акцыяй на Дзень Волі адбыліся і заплянаваныя ўладамі мерапрыемствы. У той жа час, на які прызначаны збор на Кастрычніцкай, ля Нацыянальнай бібліятэкі і ў аэрапорце «Менск-1» пачалася акцыя БРСМ. Разам з Ірынай Дарафеевай, Camerata, Якавам Навуменкам, аркестрам Фінберга і Русланам Аляхном на афішах былі заяўленыя і рок-гурты «Крок», «Killqitau», «Screamline», «Incilica», а таксама ляўрэаты «Басовішча-2004» — «Тарпач». Усе рокеры адмовіліся ад удзелу.

Ідэя рок-канцэрту ў аэрапорце належыць прадусару Анатолю Марціновічу. А.Марціновіч пацьвердзіў палітызаванасьць канцэрту: «Толькі камэрцыйныя імпрэзы могуць быць па-за палітыкай». «На ўсіх адна Беларусь, і калі людзі не разумеюць, што яны проста артысты і яны выступаюць перад людзьмі, якія прыйшлі іх паслухаць, — то гэта выключна іх праблемы», — падсумаваў памочнік рэжысэра акцыі БРСМ.

Музыкі сьцярджаюць, што ня ведалі, якая гэта будзе акцыя, таму далі згоду. І апынуліся на афішах побач зь «Тяні-Толкай» і Паплаўскай ды Ціхановічам. «Каб не падстаўляць адзін аднаго, мы параіліся, — апавядае вакалістка гурту «Тарпач» Вольга Самусік, — і вырашылі не ісьці на гэтую акцыю».

**Сяргей Будкін**

набажэнства — грэка-каталікі і праваслаўныя маліліся разам за беларускі народ. Потым было ўрачыстае паседжаньне, гістарычны даклад, чыталі вершы Арсеньневай, абмяркоўвалі сытуацыю ў Беларусі. Скончылася ўсё сьпяваньнем «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

### Дзень Волі ў Таліне

У Таліне Дзень Волі адзначылі ўскладаньнем кветак каля манумэнта палеглым у Вызвольнай вайне (1918–1920) у памяць аб Асобным Атрадзе БНР, які змагаўся за незалежнасьць Эстоніі.

**Радыё «Свабода»**

### Сем тысяч слухачоў на канцэрце ў Варшаве

У Варшаве на Пляцы Замковым адбыўся канцэрт салідарнасьці зь Беларусьсю. Мы зьвязаліся зь Лявонам Вольскім у хвіліны, калі ён рыхтаваўся выйсьці на сцэну з Вайцю-шкевічам. «Канцэрт проста афігенны. Гледачоў у два разы больш, чым было летась. Уся плошча ў беларускіх сьцягах», — казаў Лявон. Фонам у слухаўцы, падчас размовы, чулася скандаваньне «Жыве Беларусь!».

# БТ: Маніфэстанты хацелі нармальна адпачыць

«Панорама недели» на БТ ацаніла колькасьць гледачоў акцыі БРСМ «За незалежную Беларусь» у 20 тысячаў чалавек (5 тыс. каля Бібліятэкі, 15 тыс. у аэрапорце), а колькасьць выступоўцаў — у 800.

Колькасьць удзельнікаў маніфэстацыі апазыцыі была ацэненая ў тры тысячы чалавек. Рэпартаж быў зьвярстаны ў звычайнай для БТ манэры. Камэра ўнікала агульных плянаў і пазытыўных сцэнаў. Пра зьбіцьцё дэманстрантаў не паведамлялася. Рух калёны моладзі пасьля мітынгу да Нацыянальнай бібліятэкі камэнтатары БТ патлумачылі жаданьнем «нармальна адпачыць».

**СМ**




**Канцэрт «За незалежную Беларусь» каля Нацыянальнай бібліятэкі. Выступае поп-дзіва Ірына Дарафеева.**

# Мы здалёк убачылі свабоду

Колькасьць удзельнікаў Дня Волі пераўзышла прагнозы. Піша **Барыс Тумар**.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Апазыцыя захавала свой мабілізацыйны патэнцыял зь мінулага году. Варта адзначыць, што ў 1995, 1997, 2002, 2005 гадах ён істотна зьніжаўся, а цяпер, праз год пасьля выбараў, застаўся нязьменным.

Істотную частку мітынгоўцаў складалі людзі з рэгіёнаў. Істотная частка людзей з калёнаў, расьсечаных спэцназам каля Палацу Спорту на Машэрава, каля КДБ на праспэкце Скарыны і на Багдановіча, такі далучылася да асноўнай калёны мітынгоўцаў, г.зн. яны былі гатовыя да больш упартага і даўжэйшага пратэсту. І да арыштаў. Яны ўжо не баяцца прысутнасьці міліцыянтаў.

Маніфэстацыя на Дзень Волі ўвайшла ў традыцыю. Менавіта на гэты дзень найлягчэй мабілізуюцца актывісты.

Тактыка ўладаў была нязьменнай зь мінулага году: ніякіх афіцыйных кампрамісаў, запалохваньні праз мэдыі, дэманстрацыя сілы, павелічэньне колькасьці супрацоўнікаў праваахоўных органаў, задзейнічаных у апэрацыі. Прэвэнтыўныя затрыманьні актыву апазыцыі сталі практыкай.

Сілы аховы правапарадку амаль не затрымлівалі людзей у часе падзеяў. Улады, імаверна, ставілі задачу любым коштам унікнуць тэлегенічных сцэнаў разгону ці арыштаў. І выканалі пастаўленую задачу.

Навіною была арганізацыя альтэрнатыўных канцэртаў каля Бібліятэкі і ў Аэрапорце. Акцыя мела посьпех: імпрэзы сабралі некалькі дзясяткаў тысяч гледачоў.

Мітынг апазыцыі быў звычайны: з доўгімі прамовамі ня дужа гучных аратараў ад кожнай партыі і арганізацыі. Людзі звычна пачалі разыходзіцца з пачаткам мітынгу.

Затое быў прыгожы апошні акорд. Каб абараніць Мілінкевіча ад правакацый, людзі жывым калідорам праводзілі яго з жонкай да плошчы Якуба Коласа, дзе яго чакала машына.

Іншыя скіраваліся да Нацыянальнай бібліятэкі, рызыкуючы трапіць пад арышт.

Сёлетнюю маніфэстацыю вылучаў дух упартасьці і аптымізму. Гэта чымсьці нагадвала 1996 год.

# Улада з апазыцыяй згулялі ўнічыю

У расколатым грамадзтве захоўваецца статус-кво. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Уладам не ўдалося маргіналізаваць сьвяткаваньне Дня Волі ў Менску. Гэта было шматлюднае шэсьце. Але палітычным крэатывам арганізатары не бліснулі.

Напярэдадні шматкроць паўтарылі, што гэта тэст для ўладаў перад Эўропай. Масавая частка акцыі абышлася без асаблівай брутальнасьці, але казаць, што ўлады надта ўжо выстрэнчвалі перад замежнікамі, не выпадае. Ніякі тэст здаваць яны і не зьбіраліся. Адпрацавалі паводле звыклай ўжо тэхналёгіі.

Прэвэнтыўная зачыстка — раз, прэсінг па ўсёй пляцоўцы — два. Вось вам і кансалідацыя...

Але, так ці іначай, сьвята адбылося.

Завітаўшы да Нацыянальнай бібліятэкі, я зноў перажыў адчуваньне, што сёньня ў розных вымярэньнях суіснуюць дзьве Беларусі. Цалкам сувэрэнныя. У іх розныя сьцягі. У іх насельнікаў рознае сьветаадчуваньне. Але ж краіна ў нас адна. І сёньня яна на цяжкім скрыжаваньні.

Перад апазыцыяй востра стаіць праблема стратэгіі. Ці падорыць моцныя ідэі чарговы кангрэс, на дэбаты вакол якога спалена ўжо столькі пораху, — вялікае пытаньне.

Я ж з задавальненьнем глядзеў на моладзь. Яе было на акцыі шмат. І колькі б ні ладзілася добраахвотна-прымусовых імпрэзаў з папсой, псэўдафальклёрам і пахам смажняў, — яе, моладзь, кіроўныя вярхі ўсё адно прайграюць.



**Аляксандар Мілінкевіч пасьля інцыдэнту.**

# Мілінкевіч атрымаў траўмы, праходзіць курс рэабілітацыі

У панядзелак Аляксандар Мілінкевіч прайшоў мэдычны агляд. Палітык меў пашкоджаньні на левай руцэ і адчуваў болі ў сьпіне, у вобласьці хрыбта. Траўмы ён атрымаў 25 Сакавіка ў шарпаніне зь міліцыянтамі. Ён узначальваў адну з групаў маніфэстантаў, што выйшлі на сьвяткаваньне Дня Волі. Мілінкевіч у атачэньні групы найбліжэйшых паплечнікаў прыкрываў адыход дэманстрантаў, вёў перамовы зь міліцыяй і адбіваў затрыманых. Калі людзей выціскалі з вуліцы Інтэрнацыянальнай, Мілінкевіча спэцназаўцы штурхнулі так, што ён упаў.

Спэцназаўцы таксама да крыві пашкодзілі руку жонкі Мілінкевіча Іны Кулей, якая ўвесь час была поплеч з мужам.

Пасьля інцыдэнту палітык узначальваў калёну маніфэстантаў на Нямізе і праспэкце Машэрава, а пасьля пераехаў у раён плошчы Якуба Коласа, дзе ўзначаліў тых дэманстрантаў, што перабраліся на праспэкт Скарыны з раёну Нямігі.

Па словах прэс-сакратара Мілінкевіча Паўла Мажэйкі, вынікі мэдагляду дазваляюць спадзявацца, што ўжо напрыканцы тыдня палітык будзе пачувацца добра. Пераломаў ня выяўлена. Цяпер А. Мілінкевіч праходзіць курс мэдычнай рэабілітацыі.

Стан здароўя жонкі А.Мілінкевіча таксама нармальны.

**Сямён Печанко**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Ліст з Івенца: нічога ні ў кога не знайшлі, і не таму, што не было...

Размовы пра 25-га пачаліся яшчэ за месяц да ўсяго. І па клясах «органы» хадзілі, прычым не абміналі нікога, нават самых актыўных лукашыстаў. Канечне, нічога ні ў кога не знайшлі, і не таму, што не было, а таму, што як толькі прыйшлі ў першы кабінэт, праз некалькі хвілін астатнія ўжо ўсё добра ведалі і вымушаны былі на некаторы час зьняць нацыянальныя сымбалі...

Але гэтымі паходамі ўсё ня скончылася... Да самых актыўных папрыяжджалі дахаты. Прычым не абышлося без правакацый. Прыходзілі два міліцыянты і чалавек у штацкім. І гэты, як адчынялі дзьверы, пачынаў плесьці на беларускай мове, што яны прадстаўнікі нейкай дэмакратычнай арганізацыі. Што яны зьбіраюць подпісы... Лухта-лухтой! Як толькі яны апыналіся ў памяшканьні, выдавалі ўжо зусім іншае. Напрыклад, «сам усё пакажаш, ці нам пашукаць?». Але і пра гэта ўсе, каму трэ было штосьці схаваць, даведаліся вельмі хутка.

У чацьвер усіх вымусілі напісаць расьпіскі аб «неучастии в несанкционированном митинге». Напісаў такую расьпіску і клясны кіраўнік, але тут ужо было «о гарантии неучастия ваших учеников в митинге». А ў нядзелю ў школе хуценька арганізавалі спартыўнае мерапрыемства і ўсім вучням трэба было там адзначыцца. Нагадаю, што раней у нядзелю ніякіх спаборніцтваў паміж вучнямі не праводзілася...

Пакуль уся моц улад накіравана на змаганьне з «дэмакрацыяй», моладзь патрохі сьпіваецца... І няма нічога дзіўнага, бо, акрамя дыскатэкі, на якую ўсе і ідуць з мэтай напіцца, у мястэчку з насельніцтвам у 6 тысяч няма нічога! Добра, што яшчэ касьцёл з царквой, інакш было б яшчэ горш... Але ўлада нічога гэтага ня бачыць. Ёй лепш узвышаць свайго ідала Дзяржынскага, марнаваць грошы на яго помнікі ды змагацца з тымі юнакамі і дзяўчатамі, якія імкнуцца да ведаў, якія разумеюць нашмат больш, якім абрыдла ва ўсёй гэтай гразі жыць, якія імкнуцца да зьменаў, якія імкнуцца да Свабоды... Але ніхто і не зьбіраецца здавацца! Бо, як пяецца ў адной добрай беларускай песьні, «нас большае і мы пакуль чакаем...»

Івянец — маленькае мястэчка. Нас мала, але з гэтага ўсё і пачынаецца! Патрошку, але мы здолеем перамагчы і будзем жыць і працаваць у нармальнай краіне, ці, калі быць больш дакладным, жыць у краіне з нармальнай уладай, у краіне пад нацыянальнымі сымбалямі! Жыве!

**[З Івенца, разьмешчана ў камэнтарах на сайце nn.by]**

# Прамова Мілінкевіча 25 Сакавіка: «Вы творцы нашай нацыі»

У мяне пытаюцца: хто вы́йграе, а хто прайгра́е ад свабоды? Ад свабоды вы́йграюць усе. Нават тыя, хто сёньня баіцца свабоды — і яны выйграюць ад свабоды.



Вітаю вас, вольныя грамадзяне!

Вітаю сьмелых і сумленных людзей. Вы соль нашай зямлі, вы творцы нашай нацыі. Дзякуй вам, што прыйшлі сёньня на Плошчу. Дзякуй, што прыйшлі з кветкамі, сьцягамі і транспарантамі.

Яны хочуць, каб мы сядзелі дома. Наша справа кіраваць, ваша справа працаваць, кажуць яны. Гэта нашы плошчы, а вы ідзіце на балота на Бангалор, кажуць яны.

Не! Крыніца ўлады – гэта мы, гэта народ. Гэта нашы плошчы. Гэта наша дзяржава.

Мы сьвяткуем 25 Сакавіка – Дзень Волі — як найвялікшае сьвята. Таму што ў гэты дзень беларускі народ узяў у свае рукі адказнасьць за сваю краіну, за яе незалежнасьць. Сёньня гарантыяй незалежнасьці можа быць толькі дэмакратыя.

Беларусь стане дэмакратычнай. «Калі?» — пытаюцца мяне. На гэтае пытаньне не бывае адказу. Галоўнае, каб перамены адбыліся без крыві. Тады перамены будуць незваротныя.

Беларусы не прымаюць насільля. У сваім змаганьні за свабоду мы не пралілі ні кроплі крыві. Гэта нашу кроў пралівалі. Так, менавіта нашыя людзі сядзяць у турмах.

Лёгкія перамогі бываюць толькі ў кіно. За адзін раз гэта ня робіцца. Трэба раз за разам, месяц за месяцам, год за годам змагацца за сваю Свабоду.

Эўропа прапануе нам дапамогу. Яна кажа: ня бойцеся, мы падтрымаем вас. Эўропа складаецца з малых краін, такіх, як Беларусь. Там ведаюць цану незалежнасьці. Яны ведаюць, як няпроста гэта заваёўваецца.

З намі сёньня дэпутаты Эўрапарлямэнту, нашы сябры з усяго сьвету. Яны прыехалі падтрымаць нас. Давайце скажам ім шчыры дзякуй.

У мяне пытаюцца: хто вы́йграе, а хто прайгра́е ад свабоды? Ад свабоды вы́йграюць усе. Тут няма ніякага парадоксу. Нават тыя, хто сёньня баіцца свабоды — і яны выйграюць ад свабоды. Яны яшчэ ўспомняць гэтыя словы.

Свабода — гэта рух, у тым ліку і рух «За Свабоду». Гэтыя прыгожыя дзяўчаты ў памаранчавых бэйсболках якраз і праводзяць запіс ў рух «За Свабоду». Беларусь пачынае рух да свабоды, рух — За Свабоду!

Памнажайце на ксэраксах газэты. Даставайце і раскідвайце ўлёткі. Перадавайце з рук у рукі фільмы, дыскі, кнігі. Зрывайце іх прапаганду. Упірайцеся. Трымайцеся свайго. Гучна або моўчкі пратэстуйце супраць кожнай няпраўды, кожнай несправядлівасьці.

Хай кожны з вас напіша пісьмо палітвязьням, нашым героям. Я нядаўна быў у Паўла Севярынца. Вітаньні сталіцы ад мужнага Паўла! Свабоду палітвязьням!

Беларуская Воля азначае і Свабоду, і рашучасьць. Сёньняшняму беларускаму грамадзтву не хапае Волі. Волі — рашучасьці, і Волі — свабоды. Таму сёньня Дзень Волі павінен стаць днём нашай рашучасьці.

Свабода і рашучасьць вымагаюць фармуляваньня канкрэтных патрабаваньняў да рэжыму, якія б здолеў пералічыць любы актывіст дэмакратычных сілаў, якія паўтарыў бы без запінкі любы чыноўнік.

Гэтыя патрабаваньні:

Свабоду і Незалежнасьць Беларусі;

Свабоду палітзьняволеным,

Свабоду выбару!

Свабоду слова!

У гэтыя хвіліны каля Нацыянальнай бібліятэкі ідзе канцэрт БРСМ «За незалежную Беларусь». Глядзіце: мы дабіліся прызнаньня 25 Сакавіка — нацыянальным сьвятам.

Свабода і рашучасьць — гэта не таптаньне на месцы ды слуханьне прамоваў, Свабода — гэта рух, і гэты рух павінен быць бачны асабліва сёньня ў Дзень Волі.

Жыве Беларусь!

*Тэкст дасланы прэс-службай А.Мілінкевіча, ня ёсьць стэнаграмай выступу*

# Віцэ-прэзыдэнт Эўрапарлямэнту: Лукашэнка мусіць адказаць Мілінкевічу

На 25 Сакавіка ў Беларусь прыехаў віцэ-прэзыдэнт Эўрапарлямэнту **Януш Анышкевіч**. У нядзелю ён адказаў на пытаньні карэспандэнта «НН». Дарэчы, пан Анышкевіч цудоўна разумее беларускую мову.

**«Наша Ніва»: Чаму Вы адгукнуліся на прапанову Аляксандра Мілінкевіча прыехаць у Менск на Дзень Волі?**

**Януш Анышкевіч:** Для палякаў 25 Сакавіка — гэта ня толькі Дзень Свабоды Беларусі, гэты дзень нам нагадвае пра падзеі 1918 г. у Польшчы. Канечне, я таксама прыехаў сюды, каб выказаць сваю падтрымку беларускай апазыцыі ў барацьбе за дэмакратыю. Гэта падтрымка ад ўсёй Эўропы.

**«НН»: Ці мелі Вы падчас гэтага візыту нейкія сустрэчы з прадстаўнікамі афіцыйнай улады?**

**ЯА:** У маіх плянах былі толькі сустрэчы з апазыцыйнымі палітыкамі. Я вельмі баяўся, што не змагу прыехаць у Беларусь. Летась у мяне была спроба прыехаць у Менск падчас прэзыдэнцкіх выбараў, але мяне банальна не пусьцілі. Таму цяпер я не асабліва афішаваў свой візыт, каб не паўтарыўся леташні варыянт.

**«НН»: Вы не баяліся трапіць у Беларусі за краты, як было з былым паслом Польшчы Марыюшам Машкевічам, якога летась пасадзілі на Акрэсьціна на 15 сутак?**

**ЯА (сьмяецца):** Я ня раз сядзеў у турмах падчас ваеннага становішча ў Польшчы (1981–1989). Так што для мяне турма ня ёсьць новым і жахлівым. Хіба турма ў Беларусі была б для мяне нечым невядомым.

**«НН»: Ці адчуваецца, што Беларусь гатовая пайсьці на дыялёг з Эўропай?**

**ЯА:** У Эўрасаюзе, асабліва ў Эўракамісіі, ёсьць такое адчуваньне, што зь Беларусьсю трэба мець дыялёг. Праблема ў тым, каб гэтым дыялёгам не легітымізаваць беларускія ўлады. Я мяркую, што пазыцыя Эўропы ў дачыненьні да Беларусі мусіць быць падобнай да колішніх дачыненьняў між Эўропай і Польшчай часоў «Салідарнасьці», вынікам гэтага дыялёгу стала паступовае зьмякчэньне камуністычнага рэжыму ў Польшчы і яго далейшае падзеньне. Калі Аляксандар Мілінкевіч напісаў ліст Лукашэнку, то апазыцыя прадэманстравала сваю гатоўнасьць да дыялёгу. Мяне не зьдзівіла, што ваш кіраўнік яшчэ не адказаў на ліст, але ўрэшце ён будзе вымушаны гэта зрабіць. Цяпер жа Эўропа мусіць найперш падтрымліваць незалежныя грамадзянскія і палітычныя структуры Беларусі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Як Вы лічыце, ці пачаліся ў Беларусі нейкія працэсы па выкананьні 12 патрабаваньняў Эўракамісіі?**

**ЯА:** Пакуль няма ніякіх прыкметаў, што Беларусь сапраўды гатовая выканаць гэтыя пункты. Аднак я пару дзён таму гаварыў з адным прадстаўніком Эўракамісіі, дык ён глядзіць на рэчы больш аптымістычна, ён чакае зьменаў да лепшага ў Беларусі. Пачакаем — убачым, але я пакуль ня бачу канкрэтных прыкладаў пазытыўных зрухаў. Сёньняшняя акцыя апазыцыі таксама гэта пацьвярджае. Калі б улада дала без перашкодаў правесьці апазыцыі Дзень Волі, то гэта быў бы маленькі крок да нейкіх пераўтварэньняў, але яшчэ недастатковы. Найбольш важным тут бы быў крок вызваленьня палітвязьняў, але, на жаль, мы гэтага ня бачым.

**«НН»: Чаго Вы чакалі б ад акцыі апазыцыі?**

**ЯА:** Я хацеў бачыць шмат людзей, каб я мог сказаць у Эўропе, што ў Беларусі моцны дэмакратычны рух, што беларусы хочуць дэмакратыі і ў іх не апусьціліся рукі. У прынцыпе, я гэта ўбачыў.

**«НН»: Што трэба рабіць беларускай апазыцыі, каб перамагчы?**

**ЯА:** Найперш, трэба аб'яднацца, бо ў Эўропы ёсьць патрэба мець аднаго партнэра ў Беларусі, зь якім можна весьці перамовы, а не шматлікіх. У нас у Польшчы некалі была толькі «Салідарнасьць», былі нейкія дробныя арганізацыі, але яны ўсе далучыліся да «Салідарнасьці». На Захадзе ўжо ёсьць адзін беларус, які лічыцца палітыкам буйнага эўрапейскага маштабу, — гэта спадар Мілінкевіч. Ён мусіць стаць цэнтральнай асобай, на якую б усё абапіралася ў беларускім дэмакратычным руху.

**«НН»: У Вас ёсьць прагноз, калі ў Беларусі ўсталюецца дэмакратыя?**

**ЯА:** Тое, што Беларусь будзе дэмакратычнай, — гэта непазьбежнасьць. І я спадзяюся, што гэта здарыцца вельмі ўжо хутка.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# «Шалудзівыя людзі»

Лукашэнка адказаў Мілінкевічу па-свойму.

Аляксандар Лукашэнка зьявіўся на публіцы пасьля 17-дзённай адсутнасьці. Ён адрэагаваў на масавую маніфэстацыю 25 Сакавіка, абверг чуткі «пра сваю цяжкую хваробу», абвінаваціў Расею ў тармажэньні інтэграцыі, ганіў апазыцыю апошнімі словамі і паабяцаў разабрацца з заходнімі пасламі.

«Мая пазыцыя застаецца нязьменнай: мы ні за кога ня будзем змагацца і нікому ня будзем навязваць ніякіх ідэй. У нас праблем досыць, каб змагацца за моладзь на плошчах з апазыцыяй». Так адрэагаваў А.Лукашэнка на масавую маніфэстацыю 25 Сакавіка.

У сваім першым за 17 дзён публічным выступе А.Лукашэнка закрануў таксама іншыя гарачыя тэмы.

Ён зьвінаваціў Расею ў тармажэньні інтэграцыі. На ягоную думку, заключанае 23 сакавіка гандлёва-эканамічнае пагадненьне павінна пакласьці крэс праблемам у эканамічных адносінах нашых дзяржаваў. У той жа час ён

Працяг на старонцы 12.

# Сьмерць на чужыне

23 сакавіка ў Самалі ісламісты зьбілі беларускі самалёт Іл-76. Зэнітная ракета трапіла ў крыло машыны, і самалёт упаў на ўсходняй ускраіне сталіцы краіны — гораду Магадыша. На борце было 11 членаў экіпажу, усё беларусы.

Цяпер беларускія дыпляматы спрабуюць даставіць на радзіму целы лётчыкаў. Гэта няпроста, бо найбліжэйшае беларускае дыпляматычнае прадстаўніцтва аж у Абу-Дабі, Арабскія Эміраты. МЗС зьвярнуўся да ўрадаў Самалі, Этыёпіі, Уганды з просьбамі аб дапамозе.



Іл-76 належаў беларускай кампаніі «Трансавіяэкспарт» і быў зафрахтаваны Афрыканскім саюзам, які вядзе ў Самалі міратворчую апэрацыю.

За два тыдні да інцыдэнту іншы Іл-76 «Трансавіяэкспарту» быў абстраляны невядомымі на вышыні 150 мэтраў, калі заходзіў на пасадку.

Лётчыкі едуць працаваць у Афрыку, нягледзячы на рызыку, у пагоні за заробкамі. Там яны зарабляюць да дзесяці тысяч даляраў за месяц.

**МБ**

## «Шалудзівыя людзі»

**Працяг са старонкі 11.**

назваў непрымальнай наяўнасьць квотаў на пастаўкі цукру, заявіўшы, што квоты пярэчаць свабодзе гандлю. Гэтыя словы могуць служыць ідэалягічнай асновай для рэвізіі дамовы 23 сакавіка.

А.Лукашэнка ня мае намеру ўзначаліць нацыяналістычую партыю «Вялікая Расея», што было яму прапанавана стваральнікамі гэтай палітычнай сілы. «Гэты незаконна і немагчыма па заканадаўстве».

Ён абверг чуткі пра сваю цяжкую хваробу і патлумачыў сваю адсутнасьць на тэлеэкранах тым, што трошкі прытаміўся. Тым ня менш, «ён у гэты час не спыняў хакейныя трэніроўкі», расказаў ён.

Ён зрабіў таксама некалькі традыцыйных для сябе заяваў. «Алігархічнае ўлады ў Беларусі ня будзе», «намэнклятурнай прыватызацыі ня будзе» і апазыцыі ён «краіну і ўладу не аддасьць».

Ён сказаў: «Вы бачылі, як гэтыя шалудзівыя людзі, найгоршыя людзі нашага грамадзтва, напярэдадні 25 Сакавіка пісалі мне пісьмы і прапаноўвалі штосьці там правесьці разам. Мы аддалі ім найлепшыя пляцоўкі. І яны што, прыйшлі? Замест таго, каб прыйсьці і правесьці арганізаваную акцыю, паўтары-дзьве тысячы, гэты баявы атрад, пачаў расхаджваць па горадзе». Ён заявіў: «Краіну ім не аддамо. Вось тут, па--руску кажучы, па мордзе надаём таму, хто пасьмее зьвярнуць гэты працэс, які ідзе ў краіне, цяжкі, стваральны працэс».

Ён таксама паабяцаў «разабрацца з пазыцыяй пасloў», бо «паслам ні ў адной краіне сьвету не дазволена ўдзельнічаць у незаконных акцыях».

А паколькі прэзыдэнт першы раз пасьля паўзы выйшаў на публіку на вытворчасьці, у вёсцы, сярод працоўных, то гаворка пайшла і пра сельскую гаспадарку. «Аб'ём фінансаваньня праграмы адраджэньня сяла будзе ранейшы, — сказаў ён. — Але за гэтыя грошы будзе зроблена намнога больш, чым плянавалася».

Лукашэнка і сапраўды ні трохі не зьмяніўся.

**Барыс Тумар**

КАМЭНТАР

# Чаму зьнікае Лукашэнка?

Куды зьнікаў Лукашэнка з 11 да 28 сакавіка? «Кіраўнік дзяржавы знаходзіцца ў сваёй рэзыдэнцыі ў Менску, прымае чыноўнікаў з дакладамі, працуе з дакумэнтамі. Усё ў звычайным рэжыме», — паведаміў у панядзелак БелаПАН кіраўнік прэсавай службы прэзыдэнта Павал Лёгкі.

Выраз «працаваць з дакумэнтамі» ў свой час увёў у расейскі палітычны лексыкон прэс-сакратар Барыса Ельцына. Гэтак гаварылася, калі расейскі прэзыдэнт быў недзеяздольны.

Апошнімі днямі ў інтэрнэце зьявіліся чуткі аб тым, што А.Лукашэнка даўно не зьяўляецца на публіцы праз праблемы са здароўем. Яго не паказвалі на тэлебачаньні з 10 сакавіка, калі ён адпачываў на гарналыжным комплексе ў Сочы.

Яго не было на адкрыцьці турніру «Залатая шайба». Быў перанесены і візыт у Віетнам, намечаны на 25—27 сакавіка.

У аўторак П.Лёгкі раздражнёна заявіў радыё «Свабода»: «Прэзыдэнт працуе ў Менску, прымае чыноўнікаў, працуе з дакумэнтамі. Сёньня ён сустракаецца са старшынём Нацыянальнага банку Пятром Пракаповічам. Іншае пытаньне, што прэзыдэнт сапраўды адсутнічаў на экране некаторую колькасьць дзён. Ёсьць людзі, якія заўсёды нечым не задаволеныя. То ім многа прэзыдэнта на экране, то ім яго не хапае. Ёсьць у нас казлы-правакатары — можаце даць гэтую фразу — якіх проста хлебам, травой не кармі, а дай магчымасьць панагнятаць абстаноўку ў краіне. У прэзыдэнта дастаткова шчыльны, напружаны графік, у яго практычна не бывае выходных. Ён сустракаецца з чыноўнікамі — і неабавязкова тут, на Карла Маркса, 38, і неабавязкова пад прыцэлам тэлекамэр».

Нагадаем, што роўна год таму, на пачатку вясны 2006 году, здарылася падобная сытуацыя. Аляксандар Лукашэнка публічна зьявіўся на экранах 20 сакавіка. Потым ён раптам зьнік з тэлеэкранаў. Цягам тыдня не праводзіліся нарады, сходы і сустрэчы з афіцыйнымі асобамі. Абвясьцілі, што інаўгурацыя прэзыдэнта будзе 31 сакавіка, потым перанесьлі на 8 красавіка. Падчас інаўгурацыі Аляксандар Лукашэнка выглядаў стомлена, змарнелым з твару, нагадвае «Свабода». Тады таксама хадзілі чуткі, што перанос інаўгурацыі адбыўся праз пагаршэньне здароўя.

Спадар Лёгкі ня мае рацыі ў сваіх эмоцыях. Завеса сакрэтнасьці над здароўем кіраўніка дзяржавы — уласьцівасьць аўтакратый. У іх з кіраўніка робяць ідала, які, у адрозьненьне ад простых сьмяротных, ніколі не памыляецца і нават не хварэе. У дэмакратычных краінах інфармацыя пра здароўе прэзыдэнтаў адкрытая грамадзкасьці. Калі мы хочам бачыць нашу краіну дэмакратычнай, варта і з прэзыдэнта рабіць не ікону, а проста галоўнага чыноўніка.

**Барыс Тумар**

# Расейская мазута ў беларускай рацэ




Людзі даведваліся пра аварыю на нафтаправодзе «Унеча—Венстпілс» толькі пасьля таго, як мазута дайшла да Латвіі.

23 сакавіка ў выніку аварыі на ўчастку нафтаправоду «Унеча-Вэнтспілс» у Бешанковіцкім раёне адбыўся выцек каля 100 тонаў дызпаліва. Яно патрапіла ў раку Улу – прыток Дзьвіны. Беларуская служба МНС здолела ліквідаваць прарыў і сабраць асноўную частку нафтапрадуктаў. У гэтым былі задзейнічаныя 200 чалавек, 50 адзінак тэхнікі ды 10 плаўсродкаў. Тым ня менш, нягледзячы на стараньні беларусаў, некалькі тонаў дызпаліва патрапілі на тэрыторыю Латвіі.

Выклікае цікавасьць той факт, што інфармацыя пра здарэньне ў Беларусі масава распаўсюдзілася толькі пасьля таго, як патрапіла да нас з Латвіі. Гэта здарылася 26 сакавіка, пасьля таго як міністар аховы прыроды Латвіі забіў трывогу. Ягоную заяву перадало агенцтва «Інтэрфакс-Захад», і толькі тады інфармацыя пайшла ў рэспубліканскія СМІ.

Варта адзначыць, што Віцебскае абласное тэлебачаньне апэратыўна паведаміла пра здарэньне, паказаўшы сюжэт некалькі разоў. Аднак за рэгіянальнымі дзяржаўнымі СМІ ня ўсе сочаць, таму ня ўсе даведаліся пра аварыю своечасова.

У выніку аварыі з Улы ўцяклі бабры ды андатры. Беларускія ўрадоўцы ўскладаюць віну за здарэньне на расейскі бок.

**Сямён Печанко**

# Касьцёльныя ўлады ўнікаюць абвастрэньня

Болей за 5 тысячаў подпісаў сабрана ініцыятыўнаю групаю пад зваротам аб вяртаньні вернікам касьцёлу Сьвятога Язэпа і былога кляштару бэрнардынцаў. Аднак ніякай рэакцыі з боку як сьвецкіх, так і касьцёльных уладаў пакуль няма.

Камэнтуе супрацоўнік каталіцкага выдавецтва Pro Christo Мікола Гракаў: «Афіцыйныя ўлады ніяк не адрэагавалі на ініцыятыву вернікаў і, хутчэй за ўсё, не адрэагуюць, гледзячы па тым, як арганізаваны збор подпісаў. Няма нейкай цэнтралізацыі, арганізаванасьці, і зрухаў у гэтым кірунку пакуль ня бачна. Усё гэта выглядае на грамадзянскую ініцыятыву. Касьцёльныя ўлады таксама не адрэагавалі, хоць нельга сказаць, што гэтае пытаньне не закранаецца Касьцёлам. Яшчэ за Сьвёнткам пры кожным кантакце са сьвецкімі ўладамі пытаньне вяртаньня касьцёлу сьвятога Язэпа абавязкова агучвалася. Іншая рэч, што палітыка Беларускага Касьцёлу не прадугледжвае вынасу такіх пытаньняў на шырокае грамадзкае абмеркаваньне, то бок такія праблемы абмяркоўваюцца на ўзроўні сьвецкіх і каталіцкіх уладаў. Гэта зьвязана зь сёньняшняй сытуацыяй вакол касьцёлу і нежаданьнем касьцёльных ярархаў далей яе абвастраць».

* * *

Парафія Сьвятога Язэпа, што прэтэндуе на кляштарныя будынкі й касьцёл, гатовая ўзяць усе рэстаўрацыйныя працы на сябе.

Абурэньне вернікаў выклікалі пляны ўладаў пабудаваць на месцы кляштару, помніка архітэктуры XVII стагодзьдзя, гатэль, паркінг і басэйн.

Удзельніца касьцёльнага камітэту Сьвятога Язэпа Івона Мацукевіч кажа, што будынкі мусяць належыць народу, а ня тым нешматлікім заможным людзям, хто можа заплаціць вялізарныя грошы за карыстаньне паслугамі гатэльнага комплексу.

Тымчасам Упраўленьне па ахове гісторыка-культурнае спадчыны й рэстаўрацыі Міністэрства культуры выдала дазвол на правядзеньне праектных работаў па перабудове помніка дойлідства пад гатэльна-забаўляльны цэнтар... Збор подпісаў у касьцёлах Менску працягваецца.

**СХ, СП**

# Крысьціна Шацікава пра сваё «лячэньне» ў вар’ятні

Напярэдадні Дня волі, 22 сакавіка, Крысьціну Шацікаву затрымалі ў сталіцы і прывезьлі ў Магілёў. У мясцовым КДБ дэмакратычную актывістку пераконвалі ня браць удзелу ў Дні Волі, а ўзамен абяцалі спыніць крымінальны перасьлед. Пасьля адмовы Крысьціны на вуліцы на яе напалі невядомыя, зацягнулі ў машыну. З Магілёўскага псыхіятрычнага шпіталя яе выпусьцілі толькі 26-га. «Пры дапамозе санітараў мяне прывязалі і ўвесь час калолі моцныя транквілізатары», — расказвае Крысьціна.

Шацікава зьбіраецца скардзіцца ў міжнародныя інстанцыі. Беларускі Хэльсынскі Камітэт будзе дабівацца разгляду справы Шацікавай у судзе. Лідэры партый прынялі зварот да міжнароднай супольнасьці ў гэтай справе.

**МБ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**КДБ адправіла Крысьціну Шацікаву у псыхіятрычны шпіталь, аднак дактары прызналі, што ў жанчыны папросту неардынарная псыхіка.**

# Беларусь адкрывае рынак для расейскіх тавараў

Саступкі расейцам у рамках гандлёвага пагадненьня, падпісанага Фрадковым і Сідорскім, ацэньваюцца на 2—2,5 млрд даляраў. Усё дзеля танных энэрганосьбітаў.



PHOTO.BYMEDIA.NET

23 сакавіка ў Менску было падпісана міжурадавае пагадненьне пра меры ў разьвіцьці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларусяй і Расеяй. Узамен на істотныя саступкі Беларусь атрымала квоты на цукар ды гарантыю на пастаўкі энэрганосьбітаў.

Беларускі і расейскі прэм'еры сустрэліся падчас адкрыцьця паседжаньня Савету міністраў «саюзнай дзяржавы». Міхаіл Фрадкоў падкрэсьліў, што гэта пачатак пераходу да рынкавых адносінаў.

Вынікі сустрэчы: скасаваныя абмежаваньні на імпарт расейскай сельгастэхнікі, прадуктаў, у прыватнасьці, піва і тытунёвых вырабаў, спыненьне дзяржаўнага субсыдыяваньня беларускіх прадпрыемстваў-экспарцёраў. Саступкі ў гандлі абышліся беларусам у 2—2,5 млрд даляраў у год.

Адначасова былі падпісаныя пагадненьне пра пастаўкі беларускага цукру на расейскі рынак у бліжэйшыя два гады і балянс паліўна-энэргетычных рэсурсаў «саюзнай дзяржавы» на 2007 г. Скасаваныя перашкоды ў выглядзе адзінага мытнага калідору, што дзейнічаў у дачыненьні да беларускіх вытворцаў цукру. Пастаўляць цукар у Расею будуць усе чатыры беларускія заводы, кіруючыся гуртовымі цэнамі, параўнальнымі з цэнамі расейскіх вытворцаў.

Падпісаньне балянсу энэргарэсурсаў шэраг расейскіх СМІ падаюць як сустрэчны крок Расеі ў адказ на скасаваньне гандлёва-эканамічных абмежаваньняў.

Газэта «Коммерсант» ставіць у прамую залежнасьць саступкі беларускага боку ад магчымасьці Беларусі працягваць барацьбу за расейскую нафту. Паводле дакумэнту, сёлета Беларусь атрымае ад Расеі 21,2 млрд куб. м газу і ня менш за 17,6 млн тонаў нафты. Варта нагадаць, што пасьля ўвядзеньня транзытных мытаў Расеяй на пастаўкі нафты ў Беларусь, расейскія нафтавыя кампаніі заўважна скарацілі перапампоўваньне нафты на беларускія НПЗ. Але намесьнік кіраўніка Мінпрамэнэрга Расеі Іван Мацераў на перамовах у Менску патлумачыў, што балянс юрыдычна не зьяўляецца абавязковым для выкананьня. «Коммерсант» мяркуе: гэта дае Беларусі дадатковую магчымасьць апэляваць да балянсу ў выпадку далейшага разьвіцьця нафтагазавага канфлікту, дый пытаньне пра расейскі крэдыт на закупкі нафты і газу пакуль ня вырашанае.

Газэта «Ведомости» таксама падае ўвядзеньне квотаў на беларускі цукар як узаемную саступку на зьняцьце беларусамі гандлёвых абмежаваньняў. Выданьне нагадвае: падпісаць дакумэнт мусілі яшчэ 20 сакавіка, аднак беларусы не пагадзіліся з тэрмінамі ўступленьня ў сілу асобных пунктаў дамовы і настойвалі на спрашчэньні рэжыму ўвозу ў Расею аўтамабіляў. Паводле інфармацыі газэты, быў дасягнуты кампраміс: беларусы пагадзіліся на непрынцыповыя зьмены ў тэрмінах уступленьня ў сілу асобных пунктаў дамовы, а таксама далі згоду на вынас спрэчак аб пастаўках аўто па-за рамкі ўкладзенай дамовы.

Паводле словаў кіраўніка менскага аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леаніда Заікі, беларуская прамысловасьць у выніку падпісаньня дамовы можа панесьці страты, якія часткова можна кампэнсаваць за кошт паставак у Расею мяса і трактароў.

**Сямён Печанко**

## Беларусаў перасадзяць на «Жыгулі»?

Беларусь і Расея маюць уніфікаваць пошліны на ўвоз аўтамабіляў.

Пра гэта заявіў на прэс-канфэрэнцыі пасол Расеі ў Беларусі Аляксандар Сурыкаў. Гандлёва-эканамічнае пагадненьне Беларусі й Расеі, падпісанае 23 сакавіка, вядзе да ўніфікацыі мытаў на аўтамабілі, — заявіў пасол.

Гэта будзе азначаць скачок цэнаў на патрыманыя аўтамабілі эўрапейскіх вытворцаў. І бум на аўтарынках у пэрыяд да ўвядзеньня ў сілу новых нормаў.

**МБ**

# Улады пайшлі на радыкальную меру

Каб спыніць рост тарыфаў ЖКГ, Лукашэнка ахвяруе даходамі дзяржбюджэту. Адменены падатак на дабаўленую вартасьць на абароты ЖКГ.

Указам кіраўніка Беларусі ад абкладаньня падаткам на дабаўленую вартасьць вызваляюцца абароты па рэалізацыі будаўнічых працаў і рамонце жытла, а таксама жыльлёва-камунальныя паслугі фізычным асобам, паведаміла дзяржаўнае агенцтва БЕЛТА. Адпаведны ўказ А. Лукашэнкі нумар 138 «Аб некаторых пытаньнях абкладаньня падаткам на дабаўленую вартасьць» быў падпісаны 26 сакавіка.

У абгрунтаваньні, распаўсюджаным прэзыдэнцкай прэс-службай, гаворыцца, што «такія меры прыняты ў мэтах недапушчэньня росту цэнаў і тарыфаў на жыльлёва-камунальныя і эксплюатацыйныя паслугі, якія аказваюцца фізычным асобам, а таксама на работы па будаўніцтве і рамонце жыльлёвага фонду».

Дзеля таго каб абмяжаваць рост камунальных выплатаў, улады пайшлі на чарговае абмежаваньне бюджэтных паступленьняў. ПДВ за камунальныя паслугі і будаўнічыя працы складала істотную частку дзяржаўнага бюджэту.

Раней зьнізіліся даходы бюджэту ад нафтаперапрацоўкі. У гэтай сытуацыі ўрад робіцца надзвычай залежным ад атрыманьня расійскага стабілізацыйнага крэдыту. Нагадаем, што Беларусь зьвярнулася да Масквы з просьбай аб выдачы гіганцкага крэдыту памерам 1,5 мільярда даляраў. Рашэньне па ім яшчэ не прынята.

Гандлёва-эканамічная дамова, падпісаная 23 сакавіка, нявыгадная для беларускай харчовай прамысловасьці. Назіральнікі зьвязваюць падпісаньне гэтай дамовы з жаданьнем ураду атрымаць згоду Масквы 1,5-мільярдны крэдыт.

**Мікола Бугай**

### Прэмія Сапегі — Янушкевічу

Архівіст Язэп Янушкевіч узнагароджаны прэміяй імя Лява Сапегі. Узнагарода заснаваная групай польскіх унівэрсытэтаў, ляўрэат прэміі па чарзе гасьцюе ў гэтых унівэрсытэтах.

### Праграма Каліноўскага застаецца

Дырэктар польскай стыпэндыяльнай праграмы імя Каліноўскага падкрэсьліў, што вяртаньне ў Беларусь Уладзя Міхайлава, які прызнаўся ў супрацоўніцтве з КДБ, ніяк не паўплывае на рэалізацыю праграмы.

### «Дынама» — чэмпіён

Хакейны клюб «Дынама» (Менск) упершыню ўзяў залатыя мэдалі чэмпіянату краіны. Срэбра ў «Кераміну». Праз месяц стартуе і чэмпіянат сьвету. Беларусь трапіла ў групу з ЗША, Чэхіяй і Аўстрыяй.

### Хакеры скралі з мабільнага 44 мільёны

Нядаўна адзін чалавек дазнаўся, што «нагаварыў» праз мабільнік аж на 44 млн рублёў. Ён стаў ахвярай махляроў, што карыстаюцца дзіркамі ў заканадаўстве і «клануюць» сім-карты.

### Вікіпэдыі тарашкевіцай больш не існуе

Карыстальнікі інтэрнэт-энцыклясэдыі былі нямала зьдзіўленыя, калі на гэтым тыдні не знайшлі 6000 артыкулаў, напісаных клясычным правапісам. Аказалася, энцыкляпэдыю перабілі аматары наркамаўкі, якія маюць сваю вікіпэдыю — на 3000 артыкулаў. Болей пра гэтую і іншыя тэмы чытайце на сайце www.nn.by

**МБ**

## КАЛЯНДАР

### Красавік

**1** — Вербная нядзеля ў праваслаўных і каталікоў.

**4** — 450 гадоў таму (1557) нарадзіўся Леў Сапега, дзяржаўны, палітычны, грамадзкі і ваенны дзеяч ВКЛ, дыплямат і мысьляр.

**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.

**8** — Вялікдзень у праваслаўных, каталікоў і пратэстантаў.

**8** — Міжнародны дзень цыган.

**15** — 555 гадоў таму (1452) нарадзіўся італьянскі жывапісец, скульптар, архітэктар, інжынэр, вучоны Леанарда да Вінчы.

**17** — Радаўніца.

**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

**26** — 400 гадоў таму (1607) быў заснаваны Джэймстаўн — першае ангельскае паселішча на тэрыторыі сучасных ЗША.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012**   Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012**   Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір   М.П.

### Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пераказваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

**...улады хацелі давесьці, што апазыцыя парушае закон аб правілах правядзеньня шэсьцяў.**

— Вось зацьверджаны Менгарвыканкамам маршрут дэманстрацыі з Кастрычніцкай на Бангалор.






**...рэпрэсіі былі часткай акцыі «За незалежную Беларусь!».**

— А цяпер, шаноўная публіка, дазвольце абвесьціць наступны нумар. Арышт сарака апазыцыянэраў. Людзей з слабым сэрцам і псыхічна хворых просім не глядзець. Амон — на сцэну! Аплядысмэнты!

**...МУС прэвэнтыўна ўзбуджаў справы за арганізацыю пратэстаў 25 Сакавіка.**

— Вы выкліканы, спадар Мілінкевіч, па заведзеннай на Вас справе за арганізацыю несанкцыянаваных дэманстрацый 25 Сакавіка 2008 году, 25 Сакавіка 2009 году і 25 Сакавіка 2010 году.



МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА



**25 Сакавіка. Каля крамы «Купалінка» ў сталіцы.**

## 22 сакавіка

### Міліцыянты шукалі сымболіку

Маладзевага актывіста **Алега Корбана** пратрымалі больш за тры гадзіны ў РУУС Партызанскага раёну Менску. Міліцыянтаў цікавіла месцазнаходжаньне падрыхтаванай да сьвяткаваньня Дня Волі нацыянальнай сымболікі і інфармацыйных улётак.

### Салідарнасьць па-берасьцейску

У Берасьці мінакі абаранілі дэмакратычнага актывіста ад беспадстаўнага затрыманьня.

На вуліцы Савецкай да актывіста кампаніі «За Свабоду» **Андрэя Шарэнды** падышлі супрацоўнікі міліцыі, якія праверылі ў яго дакумэнты і паспрабавалі даставіць яго ў Ленінскі РУУС на той падставе, што ён нібыта нагадвае злачынцу. Сьведкі затрыманьня перагарадзілі дарогу міліцыі й не дазволілі ім пасадзіць Андрэя ў машыну. Міліцыянты не чакалі такой рэакцыі і адпусьцілі хлопца.

### Кіраўнік офісу АБСЭ сустрэўся з Артурам Фінькевічам

Оке Пэтэрсан з трэцяй спробы здолеў наведаць **А.Фінькевіча** ў Магілёўскай выпраўленчай установе №43. Днём раней адміністрацыя спэцкамэндатуры за 10 хвілінаў да канца спатканьняў прыпыніла сустрэчы са зьняволенымі, тым самым ня даўшы О.Пэтэрсану сустрэцца з Дашкевічам. Гутарка ў прысутнасьці начальніка ўстановы Аляксандра Ламазы доўжылася больш за гадзіну. Падчас яе кіраўнік офісу АБСЭ ў Менску цікавіўся ўмовамі ўтрыманьня вязьня і яго ўзаемадачыненьнямі з адміністрацыяй.

## 23 сакавіка

### Крымінальная справа па факце арганізацыі на Дзень Волі несанкцыяванай акцыі

Пра гэта заявіў начальнік ГУУС Менгарвыканкаму Анатоль Куляшоў на сустрэчы з заяўнікамі акцыі Ігарам Шынкарыкам і Анатолем Ляўковічам. А.Куляшоў паведаміў, што цягам апошніх двух дзён па краіне затрымліваліся маладыя радыкальныя актывісты, і папярэдзіў аб адказнасьці за несанкцыяваныя дзеяньні.

### Суд над Вячоркам і Сіўчыкам перанесены на 4 красавіка

Савецкі раённы суд Менску перанёс разгляд справаў старшыні Партыі БНФ **Вінцука Вячоркі** і актывіста апазыцыі **Вячаслава Сіўчыка** на 4 красавіка.

Вінцук Вячорка ў суд не зьявіўся, бо захварэў. Судзьдзя Людміла Савасьцян сказала, што суд пра гэта ня быў папярэджаны, таму афармлены прывад спадара Вячоркі ў суд на 4 красавіка. Судзьдзя Аксана Рэлява сказала, што спадар Сіўчык спазьніўся ў суд на паўгадзіны, таму адносна яго таксама афармлены прывад на 4 красавіка аб 11 гадзіне.

### Нацыянальныя сьцягі над Віцебскам

Увечары віцебскія мінакі заўважылі бел-чырвона-белы сьцяг над будынкам політэхнічнага ліцэю №1 на вул.Леніна. Праз колькі хвілін будынак акружылі міліцыянты, якія зьехаліся на чатырох службовых машынах, і нават у дварах праз вуліцу зьявіліся супрацоўнікі ў форме і ў цывільным.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Змагары

Зноў моладзь на вуліцах Менску. Дзень Волі. Тысячы маладых у першых шэрагах. Зноў — допыты, арышты, ператрусы. Дзяніс Дзянісаў чакае суду за «масавыя беспарадкі». Барыс Гарэцкі галадае на «сутках». Зьмітру Дашкевічу й Артуру Фінькевічу прыдумалі чарговыя спагнаньні, каб пазбавіць права на амністыю. У крымінальнай справе Маладога фронту — ужо пяцёра падазраваных і больш ста дапытаных у 18-ці гарадох.

А вось у Сітне — сваё змаганьне. Якраз пад Дзень Волі выдалі заробак за люты. П'янства, сваркі й кулачныя разборкі — ці то праз вясновае абвастрэньне, ці то ў выніку сэзоннага авітамінозу, ці праз усё горшае жыцьцё — і праўда лютыя. Вяскоўцы набіраюць гарэлкі, «чарніла», самагону, бы гранатаў перад танкавай атакай, — і пасьля нядоўгага расьпіцьця баі мясцовага значэньня залпам выбухаюць на кожнай вуліцы. Б'юць субутэльнікаў, слабейшых, занадта гаваркіх, падхалімаў у начальства й проста тых, хто трапіцца пад руку. Калі ў інтэрнацкім пакоі насупраць пачынаецца п'янка, можна засякаць час — праз паўтары гадзіны сьцены скалануцца ад удараў. Выглянуўшы на дзікія крыкі, можна пабачыць, напрыклад, на падлозе, у запырсканым крывёю пакоі, хлопца, які з апошніх сілаў адбіваецца ад зэдліка, дзе заблыталася нага, і да зьнямогі калоціць перакулены спружынны ложак: ваяр яўна ляснуў зь белага каня.

Колькі сіценцаў ды алёшчынцаў пасьля некалькіх дзён «змаганьня» ходзяць зь гематомамі ды пераломамі; палацкія міліцыянты, што прыязджаюць на выклікі сужыцелек ды матак, са звыклым уздыхам занатоўваюць: «Са словаў пацярпелага, выпадкова ўпаў з ганку ды ўдарыўся тварам…» Ані зьместу, ані наступстваў грандыёзных бітваў праз месяц ужо ніхто не згадае — але вось сёньня, цяпер, калі алькаголь даў у галаву і мора адчаю ды несправядлівасьці вакол здаецца па калена, можна распранутым да пояса рушыць па вуліцы, бы Матросаў на амбразуру, міма ўсіх гэтых кантораў, сельсаветаў і непрыяцельскіх хатаў зь дзікім нечалавечым ровам: «За-аб'-ю-у-у!!!»

«Ды ў мяне прапрадзед у Каліноўскага быў, чуеш?! — дыхае ў твар жывым сьпіртам аднагодак. — Ай, нічога ваша партыя не разумее…»

Ціхія, прыніжаныя вяскоўцы ды хімікі пасьля дзьвюх-трох бутэлек тутэйшага «кактэйлю Молатава» ператвараюцца ў марскую пяхоту — і адкуль толькі бяруцца сіла, нахабства ды гэтыя зьвярыны роў!

## ХРОНІКА

Міліцыянты прыглядаліся да мінакоў на вуліцы і фатаграфавалі сьцяг. Зьнялі сьцяг толькі праз паўтары гадзіны. У той жа вечар яшчэ адзін бел-чырвона-белы сьцяг зьявіўся на выезьдзе зь Віцебску ў бок Полацку. Гэтым разам сьцяг быў прымацаваны над шашой, на ЛЭП, што знаходзіцца пад напружаньнем 110 тысяч вольт.

Паводле пэўных крыніцаў, да абодвух сьцягоў былі прымацаваныя запіскі: да першага — са словамі «бел-чырвона-белы сьцяг пакажа нам дарогу», а да другога — з заклікам «рыхтуйся бараніць Радзіму!». Подпіс паўсюль быў **«Мірон»**.

### 24 сакавіка

### Міхайлаў на БТ

На БТ пасьля праграмы «Панарама» быў паказаны запіс «прызнаньняў» Уладзіслава Міхайлава. Малады чалавек вядомы тым, што нядаўна прызнаўся польскай газэце пра сваё супрацоўніцтва зь беларускім КДБ. Гэтым разам хлопец абвінаваціў праграму Каліноўскага ў падрыхтоўцы шпегаў для заходніх спэцслужбаў і паскардзіўся на дрэнныя пабытавыя ўмовы, у якіх «каліноўцы» нібыта існуюць у Польшчы.

### 26 сакавіка

### Валер'ю Шчукіну пагражаюць 2 гады зьняволеньня

Праваабаронцу і журналісту **Валер'ю Шчукіну** ў Першамайскім РУУС Віцебску высунулі абвінавачваньні ў парушэньні ч.2 арт.189 КК РБ. Шчукіну пагражае пазбаўленьне волі на тэрмін да 2 гадоў. Валерыя Шчукіна абвінавачваюць у абразе сябраў Віцебскай абласной выбарчай камісіі і сябраў акруговай камісіі №52 г.Віцебску. Пасьля выбараў у мясцовыя Саветы праваабаронца распаўсюджваў улёткі, у якіх паведамлялася, што сябры выбаркамаў удзельнічалі ў фальсыфікацыях вынікаў выбараў.

### Перасьлед апазыцыянэраў напярэдадні 25 Сакавіка

**Сяргей Лапуцін** (Магілёў) быў затрыманы, утрымліваўся ў Ленінскім РУУС Магілёва, чакае суду. **Вячаслаў Сіўчык** — затрыманы ўвечары 24 сакавіка. Паводле неафіцыйных зьвестак, у межах крымінальнай справы «арганізацыя несанкцыянаванага мерапрыемства» **Зьміцер Хведарук** атрымаў 5 сутак, **Людміла Атакулава** — 3 сутак, **Яўген Шэдка** (Менск) — 5 сутак, **Аляксей Шыдлоўскі** — 5 сутак, **Вінцук Вячорка** — абвінавачаны ў хуліганстве, суд 4 красавіка, **Алег Корбан** — затрымліваўся, яго шукае КДБ, **Мікіта Красноў** — падазраваны ў падрыхтоўцы масавых беспарадкаў, **Крысьціна Шацікава** (Магілёў) — была зьмешчаная ў мясцовую псыхіятрычную лякарню, адпушчаная 26 сакавіка, **Натальля Старасьціна** (Віцебск) — аштрафаваная судом на 10 базавых велічыняў (310 500 рублёў), крымінальная справа па арганізацыі групавых дзеяньняў, затрыманая на 3 сутак, **Аляксандар Рамановіч** (Пінск) — 5 сутак, **Канстанцін Чувак** (Пінск) — затрыманы, **Віктар Карлінскі** (Баранавічы) — затрыманы, **Барыс Гарэцкі** — 12 сутак, **Дзяніс Карноў** (Салігорск) — затрыманы, **Зьміцер Кухлей** (Масты) — 3 сутак, **Аляксандар Урыўскі** (Віцебск) — аштрафаваны судом на 10 базавых велічыняў (310 500 рублёў), крымінальная справа па арганізацыі групавых дзеяньняў, затрыманы на 3 сутак, **Максім Азараў** (Магілёў) — 7 сутак, **Ігар Банцар** (Горадня) 10 сутак, **Вадзім Саранчукоў** (Горадня) — 5 сутак, **Андрэй Фамін** (Горадня) — 7 сутак, **Зьміцер Цесьлянок** (Горадня) — адлічаны з ГрДУ, **Алесь Зарамбюк** (Масты) — прызначаны суд, ператрус у кватэры, **Сяргей Парсюкевіч** (Віцебск) — затрыманы падчас распаўсюду газэтаў, абвінавачаны ў дробным хуліганстве, **Юры Глушакоў**

Знаёмы аўганец, што доўга жыў у Расеі, неяк напісаў: наколькі ціхамірныя і апатычныя п'яныя расейцы — настолькі агрэсіўнымі й жорсткімі робяцца беларусы. Вядома, ёсьць пэўныя стадыі ап'яненьня: выходзіць, расейцы набіраюцца да поўнага атупеньня, а беларусы, наадварот, каб увайсьці ў раж ды зьдзічэць. Тым часам нацыянальны патэнцыял нянавісьці, гневу, ваяўнічасьці пагрозьліва перапаўняецца. Паводле вядомай формулы — «што ў цьвярозага наўме…», — узьнікае пытаньне: дык які ён, беларус, сапраўдны?

Ці не адсюль — фэномэны падсьвядомасьці накшталт «Зянон-хопу»?

І вось зьдзіўляесься — няўжо страшэнныя масавыя бойкі ў Сітнах, Маларытах ды Мар'іных Горках адбываюцца ў краіне, дзе толькі 15—18-гадовыя дзеці насьмельваюцца ісьці ў галаве калёны на апазыцыйным шэсьці? Няўжо танклявы «акулярык» або дзяўчынка-калясачніца, якія займаюцца незалежнай журналістыкай у раёне на некалькі дзясяткаў тысячаў жыхароў — адзіныя, хто можа ўголас казаць праўду ў вочы мясцовай уладзе? Няўжо школьнікі-маладафронтаўцы, якіх дзясяткамі дапытвае КДБ — самая сур'ёзная ў радыюсе 300 кілямэтраў ад Менску апазыцыя рэжыму?

У часы ВКЛ змагары-шляхціцы зьбіраліся на паспалітае рушаньне дзясяткамі тысячаў. Падчас паўстаньняў ды войнаў знаходзіліся тысячы змагароў, гатовых аддаць жыцьцё дзеля Беларусі.

Няўжо стагодзьдзі прыгнёту павынішчалі зь беларусаў генэтычныя коды мужнасьці, самаахвярнасьці, адвагі? Няўжо засталіся толькі жывёльная злосьць ды рабская нянавісьць, што выплёскваюцца хіба ў рабскім угары?

Беларуская моладзь даводзіць: не!

Цяпер нацыянальнаму руху якраз бракуе змагароў — моцных хлопцаў, што заступяцца за дзяўчыну, на якую замахваецца амапавец, здолеюць скруціць правакатара і не аддадуць на глум бел-чырвона-белы сьцяг.

Разам з тым, трэба разумець: на полі гвалту, зброі, нянавісьці перамагчы рэжым немагчыма. Гэта зона, падкантрольная д'яблу. Той, хто будуе змаганьне на гвалце, — непазьбежна прайграе. Гвалт супярэчыць самому паняцьцю свабоды, а свабода — гэта ўжо Божая тэрыторыя.

Таму для сёньняшняга пакаленьня нацыянальнага руху галоўнае змаганьне адбываецца не на плошчах і нават ня ў камэрах, а найпершыя ворагі — не міліцыянты ці гэбісты. Найважнейшая бітва йдзе ў самім маладым чалавеку — з боязьзю, абыякавасьцю, бязьвер'ем. Штодня, штогадзіны, штохвіліны Валадарства Нябеснае сілаю дасягаецца, і тыя, хто высільваюцца, здабываюць яго, кажа Біблія. Той, хто адолеў зло ў самім сабе, — непераможны.

А гэта значыць: менавіта змагары са страхам ды грэхам ва ўласным сэрцы будуць галоўнымі героямі нацыянальнага абуджэньня.

*Малое Сітна*

> На полі гвалту, зброі, нянавісьці перамагчы рэжым немагчыма.

## ХРОНІКА

(Гомель) — прызначаны суд, **Валер Пуціцкі** (Рэчыца) — зьбіты невядомымі, **Наста Палажанка** — затрыманая, выкліканая на адміністрацыйную камісію, **Кася Галіцкая** — затрыманая, **Сяржук Карповіч** — 3 сутак, **Пётар Кузьняцоў** (Гомель) — допыт у міліцыі, абвінавачаньні ў махлярстве, **Алесь Каліта** — затрыманы, утрымліваўся на Акрэсьціна, **Наста Александровіч** — затрыманая, утрымлівалася на Акрэсьціна, **Алесь Копаць** (Масты) —ператрус на кватэры, **Уладзімер Вялічкін** (Берасьце) — затрыманы, **Андрусь Ігнатовіч** — 5 сутак, **Міхаіл Козел** (Жыткавічы) — 3 сутак, хуліганства і абраза дзяржаўных асобаў, **Уладзімер Казека** (Драгічын) — абвінавачаны ў хуліганстве, **Аляксандра Ясюк** (Барысаў) — падазраваная ў падрыхтоўцы масавых беспарадкаў, **Уладзімер Шыла** (Салігорск) — затрыманы, абвінавачаны ў дробным хуліганстве, **Валер Мацкевіч** (Бабруйск) — затрыманы, знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрыманьня, абвінавачваецца ў дробным хуліганстве, **Уладзімер Радзівончык** (Пружаны) —ператрус, **Галіна Паўлава** (Драгічын) — затрыманая за распаўсюд віншаваньняў з нагоды 25 Сакавіка, паштоўкі канфіскаваныя, **Людміла Перадрыйчук** (Драгічын) — затрыманая за распаўсюд віншаваньняў з нагоды 25 Сакавіка, паштоўкі канфіскаваныя, **Уладзімер Шыцікаў** (Гомель) — 5 сутак, **Яўген Сувораў** (Магілёў) — утрымліваецца ў міліцыі, абвінавачаны ў хуліганстве, **Антон Ясямчук** (Магілёў) — абвінавачаны ў хуліганстве, зьмешчаны ў ІЧУ, **Ігар Сухарукаў** (Наваполацак) — 5 сутак, дробнае хуліганства, **Алесь Атрошчанкаў** — 5 сутак, **Настасься Жыўкова** , грамадзянка Украіны — 3 сутак, **Уладзімер Кацора** (Гомель) — абвінавачаны ў хуліганстве.

### Няволя ў Дзень Волі

Падчас сьвяткаваньня 25 Сакавіка былі затрыманыя **Алесь Астроўскі** (Горадня), **Павал Батуеў** (Менск), **Зьміцер Барадуля** (Віцебск), **Іван Бурыгін** (Віцебск), **Мікола Воран** (Горадня), **Сяргей Галышка** (Менск), **Аляксей Гаўруцікаў** (Віцебск), **Ян Дзяржаўцаў** (Віцебск), **Юры Жыдовіч** (Горадня), **Віктар Жылінскі** (Рагачоў), **Дзяніс Івашын** (Горадня), **Сяргей Каваленка** (Магілёў), **Зьміцер Караткевіч** (Менск), **Зьміцер, Юлія і Вольга Калантаевы** (Віцебск), **Павал Красоўскі** (Жодзіна), **Любоў Крупянская** (Горадня), **Віктар Крываль** (Узьдзень), **Марына і Ян Лагвіновічы** (Менск), **Ганна Літвінава** (Менск), **Марына Найдзіч** (Менск), **Рыгор Ніжнікаў** (Менск), **Алена Падвойская** (Менск), **няпоўнагадовая** (Магілёў), **Раман Пацалуеў** (Горадня), **Віталь Пятроў** (Жодзіна), **Максім Рудкоўскі** (Горадня), **Уладзімер Русаковіч** (Менск), **Антон Стасюк** (Берасьце), **Ядвіга Сташэўская** (Віцебск), **Сяргей Стральцоў** (Магілёў), **Юры Сьцяпанаў** (Віцебск), **Ян Талдыга** (Менск), **Уладзіслаў Токараў** (Віцебск), **Уладзімер Тамковіч** (Рагачоў), **Сьвятлана Ханенка, няпоўнагадовая** (Магілёў), **Барыс Хамайда** (Віцебск), **Віталь Ціхановіч** (Менск), **Валер Шчукін** (Менск), **Зьміцер Шыманскі** (Берасьце) — затрыманыя, **Дзяніс Галахаў** (Менск) — зьбіты пры затрыманьні, **Зміцер Кухлей** (Масты) — 3 сутак, **Яўген Тарасевіч** (Менск) — 3 сутак, **Віталь Ціхановіч** (Менск) — 3 сутак, **Уладзімер Галавань** (Менск) — 3 сутак, **Аляксандар Курбацкі** (Менск) — 3 сутак, **Аляксандар Сьцепаненка** (Менск) — 5 сутак, **Аляксандар Рубан** (Менск) — 5 сутак, **Антон Піеў** (Менск) — 5 сутак, **Канстанцін Кароль** (Менск) — штраф 2 б.в. (62 тыс. рублёў), **Тацяна Цішкевіч** (Менск) — штраф 15 б.в. (465 тыс. рублёў).

# Палова шклянкі

Пра рэпартаж БТ, палітыкаў, амон і тых, дзякуючы каму Дзень Волі застаецца галоўным сьвятам, піша **Віталь Тарас**.

## Перасоўваньне

У гэты дзень над горадам можна было бачыць расьцяжкі з заклікам прыйсьці на акцыю «За незалежную Беларусь». Радыё і тэлебачаньне ў выпусках навінаў называлі гэты дзень сьвяточным і ад самай раніцы заклікалі наведаць канцэрты ды іншыя мерапрыемствы з нагоды сьвята. З праграмы «Панарама тыдня» можна было даведацца таксама, што купка апазыцыянэраў, як заўсёды, спрабавала сапсаваць сьвяточны настрой грамадзянаў сваімі некультурнымі паводзінамі. Яны не маглі нават вызначыцца, дзе ім зьбірацца, і органы правапарадку былі вымушаныя правесьці апазыцыянэраў да месца збору ля Акадэміі навук. Удзельнікам імпрэзы, а таксама замежным дыпляматам, якія невядома зь якой нагоды назіралі за ёй, было страшэнна сумна. Яны хутка разышліся, пакінуўшы за сабой адно толькі бруд і сьмецьце.

Якая нагода сабрала ў той дзень людзей пад бел-чырвона-белымі сьцягамі і што ж за сьвята адзначала публіка на канцэрце ля Нацыянальнай бібліятэкі, засталося для шырокай публікі загадкай.

Размова, зразумела, пра 25-га Сакавіка. Ніякай іроніі тут няма. Так ці прыблізна так падзеі таго дня апісвалі дзяржаўныя СМІ. Такім чынам, улада адгукнулася на прапановы апазыцыі яднацца пад лёзунгам незалежнасьці.

Магчыма, нехта з тых, для каго Дзень Волі быў і застаецца сапраўдным сьвятам, мог угледзець пэўную іронію ў некаторых дэталях сёлетняга сьвяткаваньня.

Група дэманстрантаў на чале зь Лябедзькам і Мілінкевічам, адсечаная амонам ля Кастрычніцкай плошчы ад астатніх, доўга блукала па Менску, перш чым далучыцца да мітынгу ля Акадэміі навук. Адзін з удзельнікаў сьвята — знаёмы літаратар — назваў гэта мэтафарай. Дарэчы, даслоўна «мэтафара» перакладаецца з старажытнай грэцкай мовы як «перасоўваньне».

Тым ня менш, зьяўленьне групы маніфэстантаў на чале зь Мілінкевічам, які прайшоў пад воплескі й воклічы «Жыве Беларусь!» паўз бел-чырвона-белы натоўп да мікрафонаў на прыступках пад псэўдаантычнымі калёнамі Прэзыдыюму НАН РБ, сталася сапраўднай эмацыйнай кульмінацыяй сьвята.

Яго галоўны сэнс у тым, што Дзень Волі быў і застаўся галоўным сьвятам Беларусі. Ня дзякуючы цудоўнаму надвор’ю, пратэставым настроям (якіх цяпер, праз год пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, амаль не адчуваецца), намаганьням апазыцыі правесьці рэзанансную палітычную акцыю, а дзякуючы людзям, якім гэта сьвята патрэбнае. Не таму, што гэтага патрабуе вастрыня палітычнага моманту. А таму, што сьвята 25 Сакавіка — такая ж натуральная і неад’емная патрэба для іх, як патрэба гаварыць на роднай мове і жыць у сваёй краіне. Для многіх гэта яшчэ і дзень сустрэч — магчымасьць убачыцца й пагаманіць са старымі сябрамі і знаёмымі, якіх у бягучцы толькі й бачыш у такія дні.

Ня варта, мабыць, гаварыць шмат пра мітынг ля Акадэміі ды зьмест прамоваў, да якіх удзельнікі падобных імпрэзаў даўно прызвычаіліся. Мяняюцца хіба толькі імёны палітзьняволеных, якіх дэманстранты заклікаюць вызваліць. Вось толькі прозьвішча Казуліна, відаць, будзе гучаць на такіх мітынгах яшчэ доўга.

Зрэшты, арганізатары загадзя папярэдзілі — ніякіх штурмаў, ніякіх рэвалюцыяў, ніякіх надзвычайных мэтаў. Галоўнае — сабрацца, каб паказаць сябе, паверыць у сваё існаваньне. Маніфэстую — значыць, існую.

Што да колькасьці ўдзельнікаў… Усё залежыць ад пункту погляду — можна сказаць, што шклянка напалову пустая, можна — напалову поўная.

## Пераход

Тыя некалькі тысяч людзей, што рушылі праспэктам Незалежнасьці ад Кастрычніцкай плошчы да Акадэміі, нідзе не ўступілі ў канфрантацыю з амонам — ні каля цырку, ні далей. Яны цярпліва стаялі на пераходах у чаканьні зялёнага сьвятла, а ў раёне плошчы Перамогі не паленаваліся пайсьці на пераход ажно да вуліцы Румянцава (каб не спускацца пад зямлю), робячы досыць вялізны крук. Гэта прымусіла ўспомніць першы Марш на Курапаты. 19 гадоў назад, удзельнікі маршу таксама сабе зьдзіўляліся, спыняючыся на сьветлафорах, але рухаючыся няспынна да мэты, не зважаючы на міліцыю, якая недвухсэнсоўна пагражала разгонам (і ўрэшце ажыцьцявіла пагрозу). Нехта можа бачыць у гэтым законапаслухмянасьць і талеранцыю, нехта — пасіўнасьць і безыніцыятыўнасьць. А можна казаць пра спакойную, упэўненую ў сабе годнасьць нармальных людзей.

Гэта тое, што вывела іх на Плошчу летась 19 сакавіка ды ў наступныя дні, што прымушала прыносіць ежу й рэчы спачатку ў намётавы лягер, а потым на Акрэсьціна. Многім тады здавалася, што ў лідэраў апазыцыі не стае рашучасьці, няма нейкага адмысловага сцэнару, каб зрабіць нейкі крок і… А што мусіла б азначаць тое «і» — ніхто ня ведаў тады. Ня ведае й цяпер.

Людзі не разумелі, што яны, застаючыся на Плошчы ці ўсяго толькі прыходзячы туды падтрымаць іншых, ужо зрабілі гэты крок. Гэтыя людзі засталіся, яны нікуды не падзеліся, не схаваліся, ня зьехалі за мяжу.

Яны прыйшлі 25 Сакавіка на сваё сьвята і прыйдуць яшчэ не аднойчы.

Няма падставаў сумнявацца ў асабістай мужнасьці цяперашніх лідэраў апазыцыйных партыяў і рухаў, іх здольнасьці прымаць рашэньні. Ніхто не адпрэчвае ролі палітыкаў у гісторыі.

Урэшце, менавіта дзеяньні палітыкаў (у першую чаргу, грамадоўцаў) прывялі ў свой час да ўтварэньня БНР і абвяшчэньня яе незалежнасьці.

Пад ціскам апазыцыі БНФ Вярхоўны Савет, у якім большасьць належала камуністам, абвясьціў незалежную Рэспубліку Беларусь.

Дэмакратычныя сілы змаглі аб’яднацца й вылучыць адзінага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах і тым самым прымусілі лічыцца з сабой і ўладу ў краіне, і эўрапейскіх палітыкаў.

Але варта палітыкам усё ж часам успамінаць старадаўнюю габрэйскую мудрасьць: не чалавек дзеля суботы — субота дзеля чалавека.

## «Белы-асфальт-белы»

25 Сакавіка адбылося б у любое надвор’е. І нават калі б аргкамітэт



**Людзі ішлі да Кастрычніцкай плошчы з розных бакоў гораду. На фота: дэманстранты на Нямізе.**

абмежаваўся толькі вечарынамі ды вэрнісажамі (а так здаралася ў нядаўняй гісторыі), Дзень Волі застанецца Днём Волі — назаві яго дзяржаўным сьвятам, або нацыянальным, або апазыцыйным.

Заўсёды будуць людзі, для якіх гэты дзень будзе заставацца сьвятам.

Важна, што яны ёсьць. Можна называць гэтых людзей маргіналамі. А ўсё ж давядзецца некалі зразумець, што гэта — не г… нацыі, як казаў Ленін, але той фэрмэнт, безь якога грамадзкі арганізм даўно скамянеў бы і сканаў.

Чаму гэтага фэрмэнту не хапае, каб у грамадзтве пачалася рэакцыя брузаваньня, каб грамадзтва абудзілася,— аб гэтым палітыкі павінныя запытацца, найперш, у саміх сябе.

За дванаццаць гадоў ўлады пачалі паступова ўсьведамляць каштоўнасьць незалежнасьці. Некалі прыйдзе, нягледзячы на адчайны падсьвядомы супраціў, разуменьне, што дзяржаўная незалежнасьць — як вэктар памкненьняў і інтарэсаў паноўнай клясы альбо хай сабе лідэра краіны — сама па сабе яшчэ няшмат каштуе. Калі гэты панятак адарваны ад мовы, ад нацыянальных сымбаляў, ад культуры й гісторыі нацыі, ён губляе сэнс.

Улада намагаецца апошнім часам прысвоіць альбо прыдумаць наноў атрыбуты дзяржаўнасьці — у тым ліку й нацыянальныя сьвяты. Але пры гэтым яна нагадвае мітычнага цара Мідаса. Праўда, усё, да чаго яна дакранаецца, пераўтвараецца ня ў золата, але ў нешта процілеглае паводле кансыстэнцыі й колеру. Так, акцыя «За незалежную Беларусь» 25 Сакавіка, як выяўляецца на справе, была толькі пачаткам сэрыі сьвяточных канцэртаў, прымеркаваных да… 3 ліпеня.

Дарэчы, на расьцяжках у Менску было напісана не «За незалежную Беларусь», а «За независимую Беларусь».

Як толькі ўлада пачынае гаварыць, яна выдае сябе з галавой. Варта было паслухаць, як супрацоўнік міліцыі, які праз мэгафон па-расейску папярэджваў аб адказнасьці за правядзеньне несанкцыянаванага мітынгу, спрабаваў паўтарыць тую самую фразу на іншай дзяржаўнай мове. Акрамя словаў «увага» і «грамадзяне», сказаць нешта чалавечае ён так і ня змог, атрымлівалася толькі: «правядзеньне мітынга запрашчано». Паміж гэтым «запрашчано» і зьбіцьцём ды арыштамі дэманстрантаў сувязь падаецца амаль ідавочнай.

Але запомніцца іншае. Падчас мітынгу ля Акадэміі амонаўцы з аўтобусаў з надпісамі «Заказной», якія дзяжурылі ўвесь час на рагу вуліцы Акадэмічнай, куплялі ў шапіку мінэралку. Куплялі, стоячы ў невялічкай чарзе разам з бабулькамі, што ўдзельнічалі ў тым самым мітынгу. Людзі ў чорным стаялі спакойна, стрымана, без чаргі ня лезьлі, жмурыліся на вясновым сонцы. Амаль што ідылія.

Адна з бабулек пачала агітаваць бамбізаў у чорным: хлопцы, далучайцеся да нас — сьвята ж! Хлопцы апускалі долу вочы, некаторыя сарамліва ўсьміхаліся. У той момант яны не адчувалі варожасьці да гэтых бабулек. Здавалася, яшчэ сэкунда — і нябачная сьцяна паміж дэманстрантамі і байцамі амону счэзьне. Але гэта была ўяўнасьць. Калі б байцам далі загад, тыя пачалі б зьбіваць дручкамі ды мясіць нагамі ўсіх, хто пападзецца, — бабулек, старых, дзяцей.

Але ў той момант дзяўчаты зусім побач з амонам мірна малявалі крэйдай на асфальце сьцяг. Белы-асфальт-белы.

# Эўропа як Беларусь

Праз 50 год пасьля заснаваньня Эўразьвяз зрабіўся востравам стабільнасьці, аднак пакрысе пачынае спаўзаць у абыякавасьць. З Брусэлю піша **Алесь Кудрыцкі**.

Эўразьвязу 50 год. У заходняй прэсе ахвотна пакепліваюць: ЭЗ, маўляў, сутыкнуўся з тыповым крызісам сярэдняга ўзросту. Ён камплексуе з-за свайго веку, адсутнасьці канкрэтных жыцьцёвых плянаў ды праблемаў, выкліканых рэзкім павелічэньнем масы цела. Зрэшты, гэта проста яскравая журналісцкая мэтафара. Насамрэч, Эўразьвяз, хутчэй, нагадвае знэрваванага падлетка, перад якім стаіць праблема выбару свайго будучага шляху. Але і гэтае параўнаньне недасканалае: Эўразьвяз увогуле цяжка з чым-небудзь параўноўваць.

ЭЗ мае вялікую моц у сучасным сьвеце, але дагэтуль ня мае выразнага іміджу. Ну хіба што можна ўзгадаць распаўсюджаны стэрэатып пра тое, што правілы ЭЗ неверагодна заблытаныя, і выпрацоўвае іх безаблічная эўрабюракратыя, падобная да арміі клонаў з гальштукамі.

Добра гэта ці дрэнна? Відаць, скарэй добра. Сёньня Эўразьвяз функцыянуе хутчэй ня як саюз нацыяў, а як саюз сувэрэнітэтаў, ад якіх тыя нацыі адмовіліся. І кіруе тымі абстрактнымі сувэрэнітэтамі эўрабюракратыя. Яе паводзіны і правілы нярэдка раздражняюць, аднак калі б нейкія сябры ЭЗ вырашылі распачаць паміж сабой сур’ёзны канфлікт, то эўрабюракратыя настолькі яго запаволіць сваімі працэдурамі, што ўрэшце бойка захлынецца. Фактычна, «гальштукі» зрабілі немагчымай вайну ў ЭЗ. Натуральна, здараецца, краіны сварацца паміж сабой, аднак Эўракамісія працягвае працу, не зважаючы на зваркі. Так, большая частка Эўропы пражыла ў адносным міры ўжо паўстагодзьдзі — і гэта пасьля двух тысячагодзьдзяў войнаў!

### Урад для народу

Насельніцтва ЭЗ складае 500 мільёнаў чалавек — вялізная лічба. І гэтыя людзі ў цэлым жывуць вельмі нават заможна. Больш за тое, свае грошы яны выдаткоўваюць з карысьцю — гэтак, ЭЗ зьбіраецца да 2020 г. выйсьці на першае месца ў сьвеце па вырабе энэргіі з узнаўляльных крыніцаў, ратуючы, такім чынам, навакольле. Ёсьць чым ганарыцца, і заслуга эўрабюракратыі тут немалая.

Брусэль складае правілы, якія роўныя ды збольшага справядлівыя для ўсіх краінаў-сябраў ЭЗ. Ён не дае фірмам аб’ядноўвацца ў рабаўніцкія картэлі ды нават зьбіраецца прымусіць эўрапейскіх апэратараў зьнізіць тарыфы на мабільную сувязь. Чым ня ўлада для народу?

Эўрабюракратыя — шэрая, і калі штосьці надае ёй харызмы, дык гэта markdownрознакаляровая Эўропа. Ангела Мэркель, фэдэральная канцлерка Нямеччыны, краіны, якая цяпер пераймае прэзыдэнцтва ў ЭЗ, лічыць: «Утварэньне «фэдэратыўнай дзяржавы Эўропа» нават праз пяцьдзясят гадоў немагчымае. Мы захаваем разнастайнасьць нацыянальных дзяржаваў».

# Эўразьвяз паўсюль

ЭЗ рэгулюе ўсё — ад структурнага разьвіцьця рэгіёнаў да велічыні прЭЗэрватываў.


REUTERS

За тыя паўстагодзьдзі, што прамінулі пасьля падпісаньня Рымскіх пагадненьняў, Эўразьвяз глыбока пранізаў жыцьцё шараговых эўрапейцаў. Сёньня існуе больш за 14 500 правілаў, прадпісаньняў ды судовых пастановаў, якія рэгулююць жыцьцё жыхароў ЭЗ. Але ці заўважаюць эўрапейцы, што яны жывуць у Эўразьвязе? Прынамсі, ЭЗ не стамляецца нагадваць пра сваё існаваньне на кожным кроку.

Ад 2002 г. кожны эўрапеец штодня носіць з сабой кавалачак Эўропы — эўра. Для многіх тыя манэткі нават зрабіліся аб’ектам для калекцыянаваньня. Справа ў тым, што кожная краіна, якая зьяўляецца сябрам Эўрапейскага валютнага зьвязу, чаканіць цэнты ды эўра са сваім уласным малюнкам. А калі, прыбіраючы ў хаце, эўрапеец знаходзіць пад канапай стары пфэніг ці ліру, то дзівуецца, якім старажытным аб’ектам выглядае былая нацыянальная валюта. Праўда, эўрапейцы пакрысе губляюць адчуваньне таго, колькі ж сапраўды варты адзін эўра — так моцна вырасьлі цэны.

Эўрапейцы адразу заўважаюць, што яны жывуць у ЭЗ, падарожнічаючы на аўтамабілі. Што яднае чэскую «шкоду» з польскім нумарам ды францускі «сітраэн» з італьянскім нумарам, калі яны едуць па шашы ў Бэльгіі? Маленькі блакітны значак на нумарной шыльдзе. Нават у Беларусі нярэдка можна пабачыць на аўтамабілях блакітныя налепкі зь літарамі «BY» у вяночку з зорак. Праўда, справа тут ужо не ў дырэктывах ЭЗ, а ў праэўрапейскім настроі кіроўцы.

Найлепш, аднак, прысутнасьць ЭЗ заўважная на паліцах унівэрмагаў. Гэтак,

Новыя краіны не аслабілі Эўразьвязу, а надалі яму сьвежасьці. Канстытуцыя, зь якой так доўга няма пэўнасьці,— спосаб ператварыць ЭЗ зь бюракратычнага аб'яднаньня ў нешта, з чым чалавек сапраўды зможа сябе асацыяваць, называючыся эўрапейцам. У ідэйным пляне ЭЗ будзе няпоўны без Балканаў, Турцыі ды Беларусі з Украінай. А эўрабюракратыя здолее цудоўна ўходжвацца зь якой заўгодна канфігурацыяй краінаў.

Разнастайнасьць у Эўропе, найперш, моўная. Нездарма сталіцай ЭЗ фактычна зрабіўся Брусэль — горад у адносна невялікай краіне, дзе сутыкаюцца розныя культуры ды розныя мовы. Відаць, Менск таксама мог бы быць неблагім месцам для эўракіраўніцтва.

## Постдэмакратыя

Аднак размовы пра «крызіс сярэдняга ўзросту» вядуцца ўсё-такі нездарма. «Эўропа адчыненых дзьвярэй» — гэта рэальнасьць, аднак дзьверы тыя адчыненыя толькі паміж пакоямі эўрапейскага дому, а вокны ды ганак забітыя дошкамі. Вонкі — жорсткі візавы рэжым, патрулі на межах ды прыніжальныя допыты ў консульствах. Эўразьвяз адхапіў сабе кавалачак заможнасьці ды спакою, і жыхары ЭЗ ня хочуць яго губляць.

Эўразьвяз эфэктыўны ўнутры сябе, там, дзе ўсе гуляюць паводле адных правілаў. Няблага яму ўдаецца ўплываць і на тыя краіны, якія прагнуць сяброўства ды добраахвотна прымаюць правілы гульні. Але ЭЗ фатальна неэфэктыўны за межамі свайго непасрэднага ўплыву, там, дзе чхаць хацелі на тыя эўрапейскія прынцыпы. Колькі давялося памучыцца на Балканах! А да Беларусі Эўразьвяз вось ужо 12 гадоў ня ведае нават, як падступіцца.

Ці набліжаецца Беларусь да Эўропы? А можа, гэта Эўропа набліжаецца да Беларусі?

Эўрапейская лібэральная дэмакратыя змагаецца за выжываньне ў сьвеце, дзе яшчэ жывыя аўтарытарызм, фундамэнталізм ды маніпуляцыі празь бізнэс, а таксама спэкуляцыі на нацыянальных пачуцьцях. Людзі стамляюцца ды расчароўваюцца ў палітыцы, не ідуць на выбары. Традыцыйныя партыі пачынаюць баяцца выбаршчыкаў, не наважваюцца гаварыць пра цяжкія тэмы ды рэформы, робяцца падобнымі адна да адной, як блізьняты. А маргінальныя ды папулісцкія партыі наадварот узмацняюцца, бо ім усё роўна, якой цаной захапіць увагу электарату.

Усё часьцей кажуць пра пэрыяд «постдэмакратыі» ў Эўропе. Амэрыка загразла ў Іраку ды Аўганістане (зусім недалёка ад Эўропы, дарэчы), нафта канчаецца, людзі хочуць не свабоды, а пэўнасьці ў заўтрашнім дні. Абы не было вайны. І тут на сцэну выходзіць «постдэмакратыя» — фармальная дэмакратыя, грамадзтва, у якім птушка свабоды мае падрэзаныя крылцы. Спэцслужбы ўзмацняюцца для барацьбы з тэрарызмам, Бэрлюсконі ладзіць з дапамогай сваіх тэлеканалаў мэдыяспэктаклі ў самым сэрцы старой Эўропы, а для сапраўды дэмакратычных дэбатаў застаецца ўсё меней прасторы. Партыі робяць стаўку на асобаў, а не на праграмы, палітыка ператвараецца ў маркетынг, інфармацыйныя мэдыі — у забаўку. А людзям гэта ўсё роўна, яны хочуць спакою і ахвотна галасуюць за тых, хто абяцае стабільнасьць.

Выступаючы ў Бэрліне, Ангела Мэркель паабяцала зрабіць у сваёй прамове з нагоды 50-годзьдзя Рымскіх пагадненьняў асаблівы акцэнт на супольных каштоўнасьцях дзяржаваў ЭЗ. «Па сутнасьці, іх можна сфармуляваць адным словам — талерантнасьць», — сказала яна.

Талерантнасьць — якое беларускае слоўца! Вось толькі ці ня зьменіцца талерантнасьць усеагульнай абыякавасьцю? Гэта — праблема, аднолькава актуальная як для Эўропы, так і для Беларусі.

Эўразьвяз афіцыйна вызначае... ступень скрыўленьня гуркоў. Вылічваецца яна з дапамогай адмысловай формулы. Справа тут не ў эстэтыцы. Справа ў тым, што доўгія прамыя гуркі прасьцей транспартаваць, а караценькія лягчэй запакоўваць у шкляныя слоікі. Занадта крывыя гуркі не выкідаюцца — іх проста пераводзяць у іншую гандлёвую катэгорыю.

ЭЗ увёў нарматывы, якія вызначаюць мінімальныя памеры для ўсіх пладоў ды ягадаў. Дарэчы, ці ведаеце вы, што ЭЗ афіцыйна прызнае моркву не гароднінай, а фруктам? Уся справа тут у партугальцах. Калі б ЭЗ лічыў моркву гароднінай, то яны не маглі б экспартаваць сваё славутае маркоўнае сочыва ў іншыя краіны ЭЗ.

ЭЗ пакінуў свой сьлед на ўпакоўцы, бадай, усіх тавараў. Васьмікутнік з надпісам «BIO» паказвае, што гэты прадукт ня быў генэтычна мадыфікаваны ці вырашчаны з дапамогай хімічных угнаеньняў, а жывёлы, чыё малако ці мяса ёсьць у прадукце, утрымліваліся ў належных умовах ды спажывалі экалягічна чысты корм. Мясныя прадукты маркіруюцца маленькім авалам зь лічбава-літарным кодам. Ён паказвае, на якой менавіта фэрме вырасьцілі гэтую карову ці сьвінку. Электратэхніка, якой адчынены шлях на рынак ЭЗ, маркіруецца літарамі CE (Communauté Européenne, у перакладзе з францускай — Эўрапейская супольнасьць). Магчыма, вы таксама знойдзеце іх, зазірнуўшы пад крышку свайго мабільніка.

Эўропа, натуральна, — гэта яшчэ і агромністая маса грошай, якія Брусэль забірае сабе, а потым зноў дзеліць паміж рэгіёнамі ЭЗ, скіроўваючы іх то на будоўлі, то ў культуру, то ў сацыяльныя патрэбы. Скажам, калі ў заштатным мястэчку ў беднай грэцкай правінцыі вядзецца будоўля шыкоўнага цэнтру для моладзі, варта паглядзець на шыльду ля агароджы: хутчэй за ўсё, там будзе напісана, што аб'ект будуецца на грошы з фондаў ЭЗ.

ЭЗ яшчэ не вызначае надвор'я, але ўжо робіць спробы ўплываць на клімат (з мэтай ня даць яму зьмяняцца). Нават паветра, якім дыхаюць эўрапейцы, знаходзіцца ў сфэры дзейнасьці ЭЗ, які, напрыклад, можа абавязаць пэўны раён абмежаваць рух транспарту, калі выявіцца, што ў паветры занадта шмат газу ці пылу. Вада, якая цячэ з кранаў эўрапейцаў, таксама мусіць адпавядаць мінімальным стандартам.

ЭЗ здолеў пралезьці нават у ложкі да закаханых парачак. Яшчэ ў 1996 г. Эўрапейскі камітэт па нарманьні вызначыў нарматывы памераў прЭЗэрватываў. Гэтак, яны павінны быць не карацейшымі за 16 сантымэтраў. Пры гэтым Брусэль падкрэсьлівае: гэта толькі норма, а ня правіла. Такім чынам, ніводзін мужчына ў ЭЗ не павінен лічыць, што Эўразьвяз патрабуе ад яго адпавядаць гэтай норме.

**АК, з выкарыстаньнем матэрыялаў Die Zeit**

# «Заточка»: Пра Лукашэнку зь любоўю

У Магілёве зьявілася панк-група, якая не баіцца сьпяваць на сацыяльныя тэмы. Гурт «Заточка» ўтварыўся толькі летась, а ўжо пасьпеў праславіцца сваёй песьняй «Прэзыдэнт іграе ў хакей».

На адным з апошніх канцэртаў гурту арганізатары на выкананьні гэтай песьні адрубілі музыкам мікрафоны, але тыя дасьпявалі правакацыйную песьню пра кіраўніка дзяржавы разам з гледачамі.

Музыкі з «Заточкі» для абазнаных у магілёўскай музыцы слухачоў — асобы добра вядомыя. Гэтая каманда — пераемніца гурту, назва якога складалася зь першых літараў мянушак ейных удзельнікаў — Балдырова, Лукіна і Яўлінскага.

Нядаўна музыкі вырашылі рабіць канцэптуальна іншы музычны прадукт, таму і зьмянілі назву. На «Змагар». Іхны дэбют супаў зь леташнімі выбарнымі жарсьцямі, таму, каб уратаваць увесь фэстываль «Другі эшалён», арганізатары на афішах пазначылі назву гурту проста як «З.». Але скандалу так і не ўнікнулі. Кіраўнік магілёўскага «Цэнтру жывога року» Віталь Шум апавядае, што ў пэўны момант на пляцоўцы фэсту стала надзіва шмат міліцыі. І тут гурт «З.» пачынае сьпяваць песьню «Шэрыя» з прыпевам «Вынасіце мусар!» ды яшчэ між куплетамі адпускае кпіны на адрас супрацоўнікаў правапарадку.

«На маё зьдзіўленьне, міліцыянты ў бок сцэны нават не зварухнуліся, але пайшлі да адміністрацыі, — згадвае Шум. — Прыбягае дырэктар: «Вы тут нешта супраць міліцыі выступаеце?» — Не, — кажу. — Вам падалося. Так усё і прамінулася».

На другім сваім канцэрце гурт прэзэнтаваў свой новы шэдэўр «Прэзыдэнт іграе ў хакей». Магілёўская публіка заўжды славілася сваёй экспрэсіўнасьцю, але ТАКІМ чынам яна яшчэ не рэагавала. Гэта быў выбух ня толькі ў асобна ўзятым клюбе, але ва ўсім горадзе. Заля стаяла, войкала і ўлюлюкала. У далоні плёскалі стоячы.

«Заточка» адразу праславілася на ўвесь Магілёў — зьмест песьні перадавалі з вуснаў у вусны, пра «панкаў бяз башні» пачалі выдумляць анэкдоты.

Арганізатары наступнага іхнага канцэрту — мясцовая філія расейскага «Нашага радыё» — адразу папрасілі музыкаў ня граць песьні пра «Хакей». Тыя паабяцалі, але... абяцаньня ня выканалі. Толькі вакаліст, які называе сябе Кепка, зацягнуў «Гучыць у сэрцы толькі музыка атакі, ад вострых момантаў шалее канкурэнт...», як мікрафоны былі вырубленыя. Але некалькі дзясяткаў чалавек, якія пасьпелі ўжо вывучыць тэкст песьні разам з музыкамі, працягвалі гарланіць.

Гэты момант можна лічыць ключавым у кар’еры гурту. Цяпер яны зьбяруць любую залю ў Магілёве без праблемаў, нават без рэклямы. Па хуткім часе «Заточка» засела ў студыі і запісала свой гіт, што называецца, без купюр. А пры канцы песьні музыкі дадалі яшчэ такую мізансцэну: ідзе застаўка «Наших новостей» на АНТ, нехта на гэтым тле ўздыхае ды смачна разьбівае тэлевізар.

**«НН»: Што цябе падштурхнула да напісаньня песьні пра «Хакей»?**

**Кепка:** Паказушнасьць. І ня болей за тое. Калі Беларусь — краіна трэцяга сьвету, а народ пічкаюць сацыяльнай рэклямай пра рабства й наркаманію... Чаго тутака толькі няма насамрэч... Дый, наагул, хакей — гэта самы сэксуальны від спорту, ня тое што ўсялякія дзюдо...

**«НН»: Няўжо нармальных словаў не стае, у песьні ж столькі мацюкоў! Шалкевіч вунь і «Ультравожык» карыстаюцца хоць іншаказаньнямі...**

**К.:** Гэта наш пратэст супраць нармальных і ўсталяваных рэчаў. Калі камусьці наша творчасьць падаецца гіпэртрафавана саркастычнай — спрачацца ня буду. Калі нехта на нас будзе глядзець, як на расейскі «Ленінград», — калі ласка.

**СБ**

## Сонцавакол



**Indra, выдавец не пазначаны, 2007**

Разынка гурту — тры дзяўчыны.

Першы прыстойна запісаны дыск полацкага гурту, які стаў адкрыцьцём фэсту «Рок-Кола-2004». Яны перамаглі пры канцы году ў гіт-парадзе Эўрарадыё, за што атрымалі падарунак — запіс альбому на студыі «Rembrandt», дзе пішуцца пераможцы «Басовішча». Разынка, дакладней разынкі, гурту — тры дзяўчыны. Яны заўжды запальвалі на сцэне і выкладаліся напоўніцу.

Indra набліжаецца да таго, што потым можна будзе назваць іх стылем. Яны робяць стаўку на тэкст, ненавязьлівыя гітарныя пройгрышы гучаць на другім пляне. Галоўным інструмэнтам выступае вакал. Голас Вольгі Андрэевай цяжка назваць найлепшым жаночым рок-вакалам, але яна мае патэнцыял да таго.

Матэрыял гучыць сьвежа, а часам нават нечакана. Першая песьня «Сонцавакол» нагадала саўндам і агульнай атмасфэрай Ulis часоў «Танцаў на даху». Гэта не адзіная адсылка да беларускага року 90-х — ёсьць яшчэ кавэр на «Мясцовы час» — «Шлях дамоў». Indra не надаюць сваёй музыцы прысмаку брутальнасьці, як тое робяць «Тарпач», Indiga, «Зьмяя» ды іншыя айчынныя каманды з жаночым вакалам. Indra робіць стаўку на далікатнасьць музыкі і эмацыйнасьць тэксту. Для тых, хто слухае вушамі.

## Зара




**Drolls і Guda, Кайлас рэкардз, 2006.**

Балканскія танцы і купальскія сьпевы, жніўныя напевы і прыдворная музыка Францыі.

Супольны праект гурту зь Петразаводзку, што грае старадаўнюю сьвецкую музыку, і менскай вакальнай групы, што выконвае аўтэнтычныя сьпевы. Музыкі злучылі балканскія танцы і купальскія сьпевы, жніўныя напевы і прыдворную музыку Францыі. Ініцыявалі гэты праект расейцы — «гуды» з радасьцю пагадзіліся, бо заўжды былі адкрытыя для прапановаў. Дастаткова прыгадаць іх супольны трэк з Neuro Dubel для трыб'юту «дэпэшаў».

Аўтэнтычныя сьпевы не заўжды кладуцца на музыку — зьміксаваная яна ці сыграная на старадаўніх інструмэнтах — няважна. Як прыклад — «Дзе ты купала, купалася», аздобленая паўдзясяткам інструмэнтаў: музыка перадае зусім іншую атмасфэру, чым сьпеў. Вось і атрымліваецца: хто ў плот, а хто ў агарод. Хоць ёсьць і ўдалыя нумары — як загалоўны трэк «Зара» і «Сьвяты Яня», дзе музыкі неназойліва перадаюць атмасфэру аўтэнтычнага сьпеву. Нельга не адзначыць прафэсійны падыход, як зь беларускага, так і з расейскага боку. «Дролсы» — усе спрэс выхаванцы тамтэйшай кансэрваторыі, выдатна прапісалі кожны інструмэнт (а іх у альбоме з два дзясяткі — ад звыклай блёк-флейты да экзатычных ляндскнэхтромэля і фідэля). Пра ўнікальнасьць самой «Гуды» лішне казаць. Чакаем іх наступнага музычнага экспэрымэнту — гэтым разам са Зьмітром Вайцюшкевічам. «Зара» — для ўсіх аматараў незвычайнай музыкі.

# К началу начал




**Сердце дурака, ТА «Цэнтар жывога року», 2006.**

Магілёўцы ідуць, факт.

Самотнік ад аднаго зь яскравых прадстаўнікоў расейскамоўнай плыні магілёўскага року. «Сердце дурака» з тых, пра каго кажуць «у іх Масква ў галаве». Гурт усімі сваімі думкамі скіраваны на Маскву, кажуць, што нядаўна ў сталіцы Расеі ў іх нават фан-клюб зьявіўся. Карані гэтай музыкі сягаюць у той час, калі на зьмену «кватэрнікам» і астатняе падпольшчыныдэсыдэнтшчыны прыйшлі цалкам дазволеныя канцэрты ў рок-клюбах. Вось і бачыцца вакаліст Цімафей Яравікоў у гераічнай позе на якой запляванай сцэне з рыпучай падлогай у Ленінградзе ці Сьвярдлоўску спасярод нефармалаў, якім усё адно, пад якую музыку выстаўляць «казу». Але рок у «Сердца дурака» не пратэсна-лабавы, а болей удумлівы і вобразны. Акурат з такога пачынаў Neuro Dubel. «Стаю на краю пропасти и думаю, нахрен копал», — пяе Цімафей. На дыску бонусам прадстаўленыя роднасныя «Сердцу дурака» магілёўскія выканаўцы — «Обаяние невовлеченности» і Е.Вір, а таксама песьня «Рай побач» таленавітага гурту Nevma, які ідзе сьледам за тамтэйшымі зоркамі — «Глюкамі», Osimira і Tav.Mauzer. Магілёўцы ідуць, факт.

# Піпл про/to Purple




**Беларуска-расейскае прысьвячэньне Deep Purple, MSH-records, Vigma, 2006.**

Калі і слухаць кавэры пэўных славутасьцяў, то ў выкананьні гуртоў, далёкіх ад іхнага стылю.

Трыб'ют рок-каралям ад музыкаў дзьвюх суседніх краінаў і прадусэраў самага пасьпяховага беларускага праекту «Personal Depeche». Праўда што «Personal Purple» зьявіўся без такой помпы і выйшаў меней крэатыўным з музычнага гледзішча. Музыкі, што ўдзельнічаюць у праекце, — спрэс прафэсіяналы: тут і блюзмэн Мікола Аруцюнаў зь «Лігі блюзу», блізкі сябра Ігара Варашкевіча, які паўдзельнічаў у запісе новага альбому «Крамы», ангельскамоўныя рок-зоркі з Расеі Crossroadz і Pushking, каляроковыя пэрсанажы кшталту Сяргея Мазаева і Аляксандра Маршала. Усе яны збольшага перапяялі «пёплаў» са шчырай любоўю, але настолькі блізка да арыгіналу, што хочацца папросту ў соты раз завесьці Machine Head, каб ня слухаць прафэсійныя пера(-пад)робкі. Вынятак — акурат беларусы з Apple Tea, якія творча падышлі да зацяганай Soldier of Fortune, зрабіўшы з узорнай рок-балады вясёлае рэгі з саксафонамі, што цягам амаль чатырох хвілін перагукаюцца міжсобку.

Калі і слухаць кавэры пэўных славутасьцяў, то ў выкананьні гуртоў, далёкіх ад іхнага стылю. З дапамогаю пераасэнсаваньняў у джазе, рэгі, гіп-гопе яны маглі бы на час адбранзавець, а іх добра знаёмыя песьні — заззьяць новымі фарбамі (ці памятаеце кавэр «Тройцы» на той жа «Personal Depeche»?). Мэта гэтага праекту, наколькі можна зразумець, — выказаць любоў да мэтраў. Ну, і зарабіць крыху грошай, відаць. І ня больш за тое... Нельга не адзначыць дзікаватага аздабленьня беларускага варыянту дыску — назва праекту на тле чырвона-зялёнага сьцяга. Яшчэ б словы гімну разьмясьцілі — «Мы, беларусы, з братняю Русьсю»...

# Я хочу




**Пятро Ялфімаў, Новая музыкальная компания, 2006.**

Для тых, хто шукае сабе куміра.

Дэбютны сольнік прадстаўніка афіцыёзнага року — аднаго зь нешматлікіх айчынных рок-выканаўцаў, якія маюць дасяг да ТВ і радыё. Калісь Пятро запальваў у «Песьнярах», потым у складзе гурту «Эгаіст», а цяпер сольна. Выканаўца эксплюатуе постсавецкую любоў да рафінаванай рок-музыкі а-ля «Guns-n-Roses» — саладжавенькія тэксты «для дзевачак», крыху гітарнага драйву і награваньне на акустычнай гітары (на дыску маса напаўакустычных балядаў). Але Ялфімаў, у адрозьненьне ад плоймы іншых «дзяржаўных» выканаўцаў, ня проста карыстаецца шматлікімі дармовымі прывілеямі — ён мае на іх правы. Дастаткова згадаць яго яскравы выступ на «Славянскім базары» зь песьняй Чэслава Немэна «Dziwny jest ten swiat» (шкада, яе няма на дыску). Сьпявак мае магутны, харызматычны і пазнавальны голас, з дапамогай якога можа выцягнуць самую банальную песеньку (а такіх на ягоным альбоме — большасьць). Яму ўдаюцца баляды — вакал раскрываецца напоўніцу. Праслухаць увесь дыск Ялфімава, па шчырасьці, цяжкавата, але трэба — перадапошнім нумарам вас чакае сапраўдная разынка — песьня «Стася» (музыка аўтара «песьняроўскай» «Малітвы» Алега Моўчана на верш Язэпа Пушчы). Такіх бы песень паболей нам!

Цяжка параіць гэты дыск каму-небудзь, акрамя дзевачак, якія шукаюць сабе куміра сярод беларускіх выканаўцаў.

**Сяргей Будкін**

# Боршч

*Ў ліцьвінскай хаце*
*У сьвята, у пост*
*Здавён упрыгожаньнем стала —*
*Баршчу славянская душа!*
**Тамаш Зан**



І ў пост і на хрост.
Кухарыць **Сяргей Харэўскі.**

Хіба няма больш славянскай стравы, як боршч. Гатуюць яго, што ведама ўсім, на вадзе, мясным ці грыбным булёне, запраўляюць вэнджанінай, заскварваюць салам, затаўкаюць здорам, забельваюць сьмятанаю. Асноваю сучаснага клясычнага баршчу ёсьць цяпер тушаны бурак. Але варылі яго й з квашанай капусты, дадаючы моркву, рэпу, шчаўе, грыбы, прыпушчаныя, прытушаныя гародніны й белую капусту, падкалочвалі мукой. Боршч ядуць ад Адрыятыкі да Белымор'я. Харваты — з марской рыбаю, славакі — з гусяцінай, басьнякі — з баранінай. А беларусы — перадусім з грыбамі і са шкваркамі.

Этымалёгія слова «боршч» архаічная. Словы «боршч», «баршчэўнік», «баршчавік» існуюць ва ўсіх славянскіх мовах. Балканская «чарба» мае тую ж этымалёгію. Лінгвісты мяркуюць, што гэтым словам першапачаткова называліся расьліны з іглістымі, востраканцовымі лістамі, альбо зь пякучым, вострым смакам. З гэтага кораню выводзіцца слова «бор» — калючыя, «вострыя» хваёвыя дрэвы.

Слова «боршч» як уласна «вадкая страва з буракоў і капусты», ва ўкраінскай і расейскай мовах фіксуецца толькі на пачатку XVIII ст. У польскай яно ведамае ад XVI ст. Паводле «Encyklopedyi Staropolskej» Зыгмунда Глогера, боршч посны падаваўся ў даўнія часы як адзіная страва ў дні вігіліі Божага Нараджэньня й напярэдадні Вялікадня. Перадкалядны боршч гатаваўся на сушаных грыбах, з «вушкамі», фаршыраванымі рыбаю, альбо грыбамі. Адтуль і беларуская прымаўка «еж боршч з грыбамі, а язык трымай за зубамі»: за перадкалядным, вігілійным сталом, спажываючы посную страву, урачыста маўчаць.

Старапольскі ж звычайны боршч, што гатуюць на мясным булёне, забельваўся сьмятанаю й добра прыпраўляўся зёлкамі. Зазвычай падаецца з варанымі яйкамі. Узімку навар для такога баршчу рабіўся на костках з накроенай вэнджаніны. Польскія ж крыніцы (і ня толькі) зварачаюць увагу, што першапачаткова гэты суп варыўся з травы баршчавіка звычайнага Heiracleum sponydium.

Ён расьце на паплавах, выганах, узьлесках, па берагах рэк, у хмызьняках. Народныя назвы: баршч, баршчаўка, бядрыца. Буйное, выгінастае лісьце баршчавіка багатае на вітамін С і каратын, у каранях шмат цукраў. Яго беларусы да сёньня ядуць у самых разнастайных формах. Для зялёных салатаў лісьце варта папярэдне абдаць варам ці паўдня вымачваць у вадзе, каб выдаліць рэзкі пах. Адварное лісьце можна есьці як шпінат, адвар зь лісьця з чаранкамі нагадвае курыны булён. Парасткі зь зялёнымі сукведцямі кладуць у яечню, смажаць з цыбуляй і маслам, вараць у падсоленай вадзе як цьвятную капусту. Як закрасы спажываюць карэньне (сьвежае і сушанае), сушанае лісьце і насеньне. Пладаносіць баршчавік толькі раз у жыцьці! У часы Рэчы Паспалітае зь зяленіва й насеньня гатавалі й піва. Яшчэ ў пачатку XX ст. кісла-востры суп з баршчэўніка, што называўся баршч, быў паўсядзённай стравою жыхароў Віленскае й Менскае губэрняў.

З XVI ст. асноваю баршчу становіцца бурак. У залежнасьці ад віду баршчу буракі тушылі, варылі або запякалі. Сапраўдны творчы падыход да бурака вынайшлі нашыя землякі ў 1683 г., падчас славутае аблогі туркамі Вены.

Сьпяшаючыся на дапамогу хрысьціянскаму пасаду, войска Рэчы Паспалітае не пасьпела нарыхтаваць правіянту і, ратуючыся ад голаду, выела начыста ўсе вакольныя гароды аўстрыйскае сталіцы. У тым паходзе й быў вынайдзены спосаб хуткага гатаваньня буракоў шляхам затушваньня. А яшчэ лепей — перад варкаю пасмажыць на сале! Шляхецкія кухмістры, падгледзеўшы кулінарныя сакрэты ў турак, апроч абсмажваньня скрылёчкаў бурака ў тлушчы, навучыліся захоўваць і колер, дзякуючы дабаўкам воцату альбо белага сухога віна.

Дзеля смаку многія баршчы вараць на квасе-сыраўцы або бураковым квасе. Яго прыгатаваць вельмі проста. Спатрэбіцца 2 л гатаванае вады, паўкілё жытняе мукі, 10 г дражджэй. У цёплай вадзе распусьціць з дражджамі 1—2 ст. лыжкі мукі, даць пабрадзіць. Будзе блізу 1,5—2 шклянкі закваскі. Астатнюю муку заліць гарачай вадой, замясіць негустое цеста й паставіць у цёплае месца. Дадаць закваску, разьвесьці цеста цёплай вадой. Па выкарыстаньні квас можна 3—4 разы даліваць халоднай вадой.

Для прыгатаваньня бурачнага квасу спатрэбіцца 10 л гатаванай вады і 5 кг буракоў. Буракі памыць, пачысьціць, 1/5 частку ад іх нарэзаць кружкамі, перамяшаць з цэлымі буракамі, заліць халоднай вадой і паставіць у цёплае месца. Як скончыцца браджэньне, паставіць у халоднае месца. Праз 13—15 дзён квас можна ўжываць. Па выкарыстаньні яго таксама можна 3—4 разы даліваць. Зрэшты, цяпер салодкі боршч з буракоў кісьляць сыроваткай, гурковым ці капусным расолам, квасам, воцатам. Альбо, як і спрадвеку, шчаўем.

Вельмі важна для любога баршчу — захаваньне рубінава-гранатавага колеру. Вось тут спосабы й выяўляюць сваю нацыянальную сутнасьць. Ці, лепей сказаць, гаспадарча-кліматычныя адрозьненьні. Дзеля таго, каб стракатая палітра цёплых таноў ня страціла прывабнасьці ў час тэрмічнай апрацоўкі, перад закладаньнем бураковае масы ў боршч яго трэба падкісьліць. Калі на поўдні Балканаў у якасьці кісьліны, што зьберагае зіхоткую чырвань, можна ўжыць цытрынавы сок, крыху паўночней — натуральныя памідоры з баклажанамі, то ў нашых краях — сама лепей шчаўе, журавіны, квашаную капусту ці кіслыя гурочкі. Смачны выходзіць боршч з дадаткам кіслых зялёных яблыкаў. Ужываюць у якасьці акісьляльніка… рэвень. У «беларускі боршч» таматы, баклажаны ці папрыка не надаюцца.

Прыгатаваны па ўсіх правілах, боршч можа скласьці ўвесь абед. «У палешука пачэснае месца адведзенае баршчу — ён першым падаецца на стол», — пісаў Павал Шпілеўскі ў сваім «Путешествии по Полесью…». Ядуць яго і на вячэру.

У палешукоў, як даўней і ва ўсіх славянаў, боршч — страва сакральная. Ярка-чырвоны колер асацыюецца з ахвяраю. На Макавея ў многіх раёнах Беларусі ля

калодзежаў служыцца малебен. Этнографам вядомы старажытны беларускі звычай выліваньня баршчу ў калодзеж. Рабілася гэта ў сухмень. Густы боршч сымбалізаваў густы дождж. Рытуал яшчэ можна ўбачыць месцамі на Століншчыне й Тураўшчыне.

Рэцэпт клясычнага палескага баршчу нескладаны, але вымагае паважнасьці й спакою ў працэсе гатоўлі. Вазьміце 80 г сухіх белых грыбоў, 300 г бульбы, паўкачана белае капусты, 3 невялікія буракі, 1 корань пятрушкі, 1 моркву, 1 цыбуліну, каліва кораню салеры, 2 шклянкі бурачнага квасу, маленькую лыжку мукі, паўшклянкі сьмятаны, 100 г сьметанковага масла, 2 жаўткі, ляўровы ліст, перац, цукар, соль. У сучасным варыянце няблага дадаць траціну шклянкі таматнае пасты.

За ноч замочаныя грыбы зварыць, булён працадзіць. Пасьля чаго грыбы дробна накроіць. Нашаткаваныя буракі патушыць з часткаю грыбнога булёну.

У кіпячы грыбны булён, пакласьці нарэзаную бульбу, за хвілінаў пяць, і нашаткаваную капусту. Гэта агульнае правіла — бульба гатуецца раней за іншую гародніну (!), бо ў падкісьленай вадкасьці (з сокамі капусты ці бурака) яна не разварваецца як мае быць. Варыць капусту з бульбаю разам блізу 10 хвілінаў. Затым дадаць пасэраваныя цыбулю, моркву, пятрушку з таматам-пюрэ, здрабнёныя вараныя грыбы, падсмажаную на масьле і разбаўленую грыбным булёнам муку, соль, перац, цукар, даць пакіпець 5 хвілін, уліць бурачны квас і давесьці да гатоўнасьці. Перад ужываньнем у талерку з баршчом варта дадаць тлустае сьмятаны, зьмяшанае з сырымі жаўткамі, зяленіва, пятрушку, салеру, кроп, зялёную цыбулю — на асабісты густ. Гэта страва ня посная, але амаль вэгетарыянская.

А вось посныя баршчы — клясыка нашае кухні. Іх галоўная вартасьць — хуткасьць прыгатаваньня. Ну й колькасьць вітамінаў таксама. Наш боршч у пост можна прыгатаваць за паўгадзіны. Калі ёсьць досьвед — то й хутчэй! Гатовы сьвежы посны боршч падаецца на стол не абавязкова адразу, гарачым. Наадварот, пастаяўшы колькі часу, ён толькі стане лепей, набрыняўшы рознымі адценьнямі натуральных смакаў! Добры падсілак у пост.

Ёсьць і іншыя варыянты. Напрыклад, ведамы з XVII—XVIII ст. і слынны посны «гетманскі» боршч. Яго падавалі на пост у халодным выглядзе. У ім плавалі «балабушкі» — фрыкадэлькі зь мяса шчупака, нашпігаваныя тоўчанымі белымі сухімі грыбамі, масьліны й алівы, смажаныя ў алеі паніровачныя карасікі. Да такога поснага баршчу дадаваліся, посныя ж, смажаныя піражкі з кіслай капустаю, кашамі, грыбамі.

Старадаўнія посныя баршчы гатаваліся на канапляным алеі, бо са сланечніку цэнуць алей даўмеліся нядаўна. Заўжды былі капуста й буракі. А вось бульба, безь якое немагчымы сёньня беларускі боршч, у ім зьявілася толькі гадоў сто таму. Затое зьнікла з баршчу пшонка, безь якое не абыходзіўся хіба ніводзін наш старасьвецкі суп. Зрэшты, экспэрымэнты з грэчкаю й рысам у баршчы таксама адышлі ў нябыт.

Асобны разьдзел складаюць баршчы халодныя. Ідэальны падмацунак у летні сквар, гоіць наступствы гулянак, спаталяе смагу, гоніць сум, пасявае ў душах аптымізм. Хоць бы такі жыцьцядайны рэцэпт: бураковае бацьвіньне памыць, накроіць саломкаю, крыху абсмажыць, а бурачныя чаранкі нарэзаць дробнымі кубікамі. Туды ж дадаць каліва морквы, салеры й пятрушкі. Шчаўе перамыць, парэзаць па дыяганалі. Нарыхтаваную гэткім чынам гародніну, зьмяшаць са шчаўем. Тушыць усё разам (без бурачнага лісьця) у невялікай колькасьці вады й алею да патрэбнае мяккасьці, дадаць бураковае бацьвіньне й падтушыць хвілінаў сем. Пасьля гэтага дадаць крышку солі, тоўчанага кмену, заліць халодным кіслым малаком. Дзеля харашыні ўкіньце жменю журавінаў альбо брусьніцаў. Адзін невялікі сьвежы гурок надзярыце на тарцы, дадайце туды сама. Пры патрэбе крышку разбавіць гатаванай астуджанай вадою. Засыпаць зьверху дробна пасечанай пятрушкаю зь зялёным кропам. Паставіць у халоднае месца на чвэрць гадзіны.

Крыху складанейшы летні сялянскі боршч. На чатыры-пяць порцыяў спатрэбяцца: 400 г абабраных буракоў, 400 г абабранае бульбы, 200 г сухіх яблыкаў, 2 сьвежыя агуркі, 2 яйкі, вялікая лыжка воцату, лыжка цукру, паўшклянкі сьмятаны, паўшклянкі дробна нарэзанае зялёнае цыбулі, тры зубкі часныку, кроп, зялёная каляндра на смак, соль.

Перадусім буракі сьпекчы ў печы (духоўцы), абабраць, нарэзаць кубікамі, апырскаць воцатам, даць пастаяць. Зварыць нарэзаную кубікамі бульбу. Сушаныя яблыкі ў асобным начыньні зварыць да напаўгатовасьці, зьліць адвар, зьмяшаць яго з бульбяным, астудзіць. Пакласьці ў адвар звараныя бульбу і садавіну, падрыхтаваныя буракі. Дробна накроіць кроп і зялёную каляндру, перацерці з часныком, укінуць у страву, перамяшаць. Затым дадаць нарэзаныя агуркі і вараныя яйкі, заправіць сольлю, цукрам. Ужо ў талерку з гэтым баршчом пакласьці халодную сьмятану, а таксама зялёную цыбулю й рэшту кропу, дзеля прыгажосьці.

Прывядзем яшчэ колькі запазычаных зь літаратуры беларускіх традыцыйных рэцэптаў:

**Боршч халодны**

*800 г буракоў, 600 г бульбы, 2 яйкі, 2 агуркі, 0,5 шклянкі сьмятаны, 2 ч. лыжкі цукру, 4 ст. лыжкі скрышанай зялёнай цыбулі, зялёныя кроп, салера, каляндра, 1 ст. лыжка скрышанага кропу, па 4 шклянкі бурачнага і бульбянога адвару, воцат, соль.*

Палову буракоў сьпекчы, абабраць, нарэзаць саломкай. Астатнія абабраць, зварыць у падкісьленай воцатам вадзе, таксама нарэзаць. У асобным посудзе зварыць абабраную бульбу, нарэзаць брусочкамі. Падрыхтаваную агародніну заліць зьмяшаным адварам буракоў і бульбы, ахаладзіць, затым дадаць нарэзаныя сьвежыя агуркі, вараныя яйкі, зяленіва, соль і цукар. Усё добра перамяшаць. Пры падачы на стол пакласьці сьмятану і кроп.

**Борш па-менску**

У вялікім рондлі зварыць булён на мясных костках. Калі мяса будзе напалову гатовае, пакласьці ў булён 1 ачышчаную бульбіну цалкам. Парэзаць 1/5 невялікай галавы капусты, 2 бульбіны — кубікамі, апусьціць гародніну ў булён. Засыпаць 1,5 жмені вымачанай (як мінімум некалькі гадзін) фасолі. Асобна зварыць 2 бурачкі, пачысьціць і падраць на тарцы з буйнымі дзірачкамі. Дробна парэзаную цыбуліну і надраную моркву пасмажыць у алеі, дадаць у патэльню 2 ст.л. таматнага соўсу і даць хвіліну пакіпець. Калі капуста, бульба і фасоля зварацца, выключыць агонь, дастаць косткі, зрэзаць мяса ў боршч, цэлую бульбіну дастаць, раструшчыць відэльцам і пакласьці назад у рондаль. Толькі зараз усё можна пасаліць на смак. Дадаць у булён смажаныя цыбулю і моркву з соўсам, нацертыя вараныя бурачкі. Туды ж — 3 дробна парэзаныя нажом зубкі часныку (калі прапускаць праз часнычніцу, боршч будзе менш духмяным), 1 ст.л. дзевяціадсоткавага воцату, 1 ст.л. цукру, 4—5 гарошкаў чорнага перцу і 1—2 духмянага, некалькі ляўровых лісткоў. Можна крыху хмелі-сунэлі, чырвонага перцу. Даць баршчу настаяцца пад накрыўкай хвілін 15. Зяленіва на смак. Заправіць кіслым малаком.

**Боршч на дождж**

*500 г падвэнджанае сьвініны, 2 квашаныя буракі, 2 цыбулі, 1 морква, паўшклянкі сьмятаны, корань пятрушкі, 0,5 кораня салеры, 50 г сьметанковага масла, 1 ст. лыжка мукі, соль, перац чорны, духмяны й чырвоны, ляўровы ліст, мушкат, каляндра, кмен, часнык, зяленіва салеры й кропу.*

Вэнджаную сьвініну пасекчы невялікімі кавалкамі, заліць халоднай вадой і паставіць на моцны агонь. Калі вада закіпіць, зьняць пену, пасаліць і варыць на слабым агні да гатоўнасьці мяса. Тлушч, што выступае на паверхні, акуратна здымаць. Яго можна дадаць пры абсмажваньні ў алеі нарэзаных цыбулі, морквы, пятрушкі, салеры. Апусьціць іх незадоўга да гатовасьці мяса. Булён працадзіць. Квашаныя буракі нарэзаць саломкай або надраць на буйной тарцы і патушыць, заліўшы булёнам. Затым апусьціць у падрыхтаваны булён, дадаць падсмажаную на масьле і разбаўленую булёнам муку, пацяруху перцаў з мускатам, ляўровы ліст, даць баршчу трошкі пакіпець, дадаць паўтузіну зубчыкаў часныку. Перад падачаю на стол заправіць сьмятанаю, засыпаць зяленівам. Гэты цалкам беларускі рэцэпт надаецца, калі за вакном дождж, а за сталом сябры.

## МАЯ ЛЬВОВІЧ

БЕЛАРУСКАЯ ВОЛЯ

Беларускай Волі, здабытай
У доўгай няроўнай бітве,
Адмерана было веку
Адзін, толькі адзін,
Аднюсенькі дзень.
Дваццаць пятага сакавіка.
Васемнаццатага году.
Дзень прамільгнуў і згас,
Ды гарыць і сягоньня
Беларуская Воля ў нас.
Пакуль за яе
Нехта на бітву йдзе,
Нехта ўстае да бою,
Жыве і той дзень,
Жыве і той дзень адзін,
Аднюсенькі дзень жыве
Беларускае Волі.

*4 сакавіка 2007, Харкаў*

## КІРЫЛ ХІЛЬКО

* * *

Зойдзеш стомлена ў дом,
Зьнімеш з плеч паліто,
А з усіх закутоў:
Ты — ніхто, ты — нішто...
Ты сабе пішаш лёс —
Ды нібы па вадзе;
Адусюль: ты — ніхто,
Ты — адзін, ты — нідзе...
Скінь аковы свае!
Нельга жыць болей так:
Вырашай за сябе,
Загасі ў вачах страх.

## СЬВЯТАМІР АЛЕСЬНІЦ

ДРЫГВА

Зімовым вечарам ці летнім днём
Мае сябры зьнікаюць у пошуках драгсу.
Яны прападаюць адзін за другім,
За кайф яны плоцяць жыцьцёвую таксу.
Нам напляваць на жахі і боль,
Нам напляваць на бацькоўскія сьлёзы,
Мы выходзім у ноч нетрывалай паходкай,
Мы выходзім у ноч у пошуках дозы.
І дарэмна нас вучаць: «Наркотыкі — сьмерць»,
Мы самі сябе ўяўляем у труне.
Ты ніколі ня выйдзеш на роўную сьцежку,
Калі апынуўся па горла ў дрыгве.
Вы спытаеце нас: «Навошта так жыць?!»
Адказ будзе просты, як двойчы два, —
Ты ня зможаш выйсьці з жыцьця сухім,
Калі твая Радзіма — дрыгва!




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дзень Волі 2007.**




Заканчэньне коміксу ў наступным нумары

http://www.tanakaland.org

# Гастролі тэатру імя Якуба Коласа ў сталіцы

У год 80–годзьдзя тэатру коласаўцы запрашаюць сталічнага гледача. З **1 да 5 красавіка** ў памяшканьні **Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатру імя Янкі Купалы** адбудзецца паказ сямі найлепшых спэктакляў славутага тэатру з поўначы ў пастаноўцы Віталя Баркоўскага.

**1 красавіка, нядзеля, 19.00.** Гастролі распачынаюцца мэлядрамай «Чорная нявеста» па драматычнай паэме Аляксея Дударава «Чорная панна Нясьвіжу». У гледачоў будзе магчымасьць параўнаць спэктакль, прапанаваны коласаўцамі, зь містычнай легендай аб любові, што ідзе на сцэне тэатру імя Янкі Купалы.

Здані мінулага ажываюць на сцэне. Таямніца Барбары Радзівіл, загадкі стагодзьдзяў, сярэднявечча. Часы, калі грошы і ўлада ставяцца вышэй за чалавечыя пачуцьці.

**2 красавіка, панядзелак. А 16-й гадзіне на Малой сцэне** — замежная драматургія. Урс Відмэр, **«Тузы»**. Танец згубленых душаў — так вызначаны жанр пастаноўкі.

А **19 гадзіне** на Вялікай сцэне будзе прадстаўлены спэктакль «Бацька». Драма Аўгуста Стрындбэрга ў пастаноўцы Віталя Баркоўскага, праект народнай артысткі Беларусі Сьвятланы Акружной, якая выйдзе на сцэну ў ролі Ляуры. «Маці вядомая заўсёды», — так казалі яшчэ ў старажытнасьці. А вось бацька...

**3 красавіка, аўторак, 16.00, Малая сцэна.** Трагікамэдыя Ўладзімера Драздова **«Мадам Боншанс»**. Другая частка трылёгіі пра жыцьцё й лёс мастакоў, што нарадзіліся на беларускай зямлі і сталі вядомымі на ўвесь сьвет. Хаім Суцін натхніўся Парыжам, там ён ствараў свае шэдэўры. Ім захапляўся маэстра Мадыльяні і ў спадчыну пакінуў пасьля сябе Мадам Боншанс.

Тэатар пабываў з гэтым спэктаклем на шматлікіх міжнародных фэстывалях.

**19.00, Вялікая сцэна. «Дакрануцца вуснамі да нябёсаў»** — трагікамэдыя па матывах п’есы Тэнэсы Ўільямза «Стары квартал».

У старым квартале сваё жыцьцё, свой мікрасусьвет. Людзі паміраюць ад адзіноты. Стары квартал, стары дом... Маладосьць... Пэрсанажы з далёкага мінулага. Толькі цені...

**4 красавіка, серада. 19.00, Вялікая сцэна.** З творчай спадчыны Ўладзіміра Набокава нам засталіся ня толькі яго раманы і апавяданьні. **«І сьмех, і сьлёзы, і Любоў»** — трагікамэдыя па матывах п’есы Ўладзіміра Набокава «Падзея». Фарс, пародыя, роспач. Нішто не праходзіць бяз знаку. Мінулае вяртаецца і не дае спакою.

**5 красавіка, чацьвер, 19.00, Вялікая сцэна.** Мы запрашаем вас на карнавал! Варыяцыі паводле Янкі Купалы. **«Сон на кургане»** — так называецца спэктакль па творах славутага песьняра. Словы Купалы ў мадэрнізьме Баркоўскага.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Тэатар імя Янкі Купалы ў Віцебску

2–6 красавіка Нацыянальны акадэмічны тэатар імя Янкі Купалы праводзіць гастролі ў Віцебску. Купалаўскі тэатар прадставіць віцебскаму гледачу пяць спэктакляў.

**2 красавіка** Купалаўскі тэатар адкрывае гастролі містэрыяй «Сымон–музыка» паводле Якуба Коласа. Яркія самабытныя характары, вобразы жыцьцёвых пэрсанажаў у выкананьні суквецьця зорак беларускай сцэны стварылі незабыўнае тэатральнае відовішча ў рэжысуры Мікалая Пінігіна.

У спэктаклі занятыя народныя артысты Беларусі Генадзь Гарбук, Арнольд Памазан, Мікалай Кірычэнка, заслужаныя артысты Беларусі Віктар Манаеў, Зінаіда Зубкова, Натальля Качаткова, а таксама моладзь тэатру. У ролі Сымона — Аляксандар Малчанаў. Сцэнаграфія і касьцюмы — Алесі Снапок-Сарокінай, кампазытар — Андрэй Зубрыч.

**3 красавіка** віцяблянам прапануецца містычная камэдыя «Чычыкаў» паводле паэмы Мікалая Гогаля «Мёртвыя душы», сцэнічная вэрсія маладога драматурга Андрэя Курэйчыка.

**4 красавіка** тэатар запрашае на спэктакль «Маэстра» па п’есе сучаснага ўкраінскага драматурга Марыі Ладо.

У спэктаклі 26 дзеючых асобаў — цэлы сымфанічны аркестар. Гучыць многа музыкі — Моцарта і ня толькі. Таму рэжысёр вызначыў жанр спэктаклю як «рэпэтыцыя аркестру ў 2–х дзеях». Мастак — народны мастак Беларусі Барыс Герлаван. У галоўных ролях — Раман Падаляка і Аляксандар Малчанаў.

**5 красавіка** на сцэне тэатру містычная легенда аб любові «Чорная панна Нясьвіжу» Аляксея Дударава. Пастаноўшчык Валер Раеўскі ў садружнасьці з мастаком Барысам Герлаванам, кампазытарам Віктарам Капыцькам і балетмайстрам Марынай Дударавай стварае на сцэне спэктакль–сон, спэктакль–мрою.

**6 красавіка** закрываюцца гастролі прэм’ерай–рэквіемам «Вечар» Аляксея Дударава. Пранізьлівая гісторыя пра самоту, забыцьцё й пакаяньне. Рэквіем па добрых людзях, якія не дакахалі, але засталіся тымі, кім былі заўжды.

**Паводле прэс-службы Купалаўскага тэатру**

## ВЫСТАВА



**Выстава Фэрнана Лежэ**

**З 26 сакавіка да 10 красавіка ў Нацыянальным мастацкім музэі** адбудзецца выстава твораў Фэрнана Лежэ й Надзеі Хадасевіч-Лежэ. Экспазыцыю складуць графічныя творы, падораныя ў 1960–1970-я гады музэю нашай суайчыньніцай Надзеяй Хадасевіч-Лежэ.

## КАНЦЭРТЫ

**Сустрэча 1 красавіка**

**31 сакавіка а 19.00 у клюбе «Катакомбы»** (Рабкораўская, 2 — Вакзал, Дружная) сустрэча 1 Красавіка з удзелам групаў: **Адыс-Абеба, Zigzag, Tarpach, Iris7, Мамкіны пацеркі, Рокаш, Драма**. Гумар, конкурсы, шоў-праграма. Цана білета: 10 000 загадзя, 12 000 у дзень канцэрту. Т. 605-56-08, 140-08-53, 559-59-46.

**Прэзэнтацыя мэтал-зборніка**

**У пятніцу, 13 красавіка, у клюбе «Арэна»** (вул.Талбухіна, 4) — прэзэнтацыя зборніку **«Metallection 4»**. Мэтал заграюць: «Soncavarot», «Imprudence», «Partyzone», «Straight land», «Nasa vajna», «Aquamorta». Кошт квіткоў ад 10 да 15 тысяч рублёў. Пачатак а 19-й.




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# 300 спартанцаў

**300 спартанцаў** (300)

ЗША, 2006, каляровы, 117 хв.

**Рэжысэр:** Зак Снайдэр.

**Ролі выконваюць:** Джэрард Батлер, Лена Гэдзі, Дамінік Ўэст, Вінсэнт Рэган, Міхаэль Фасбэндэр, Эндру Плівін.

**Жанр:** Эпічны комікс паводле твору Фрэнка Мілера «Frank Miller's 300».

**Адзнака:** 7 (з 10).

Прэзыдэнт выказаў рэзкае раздражненьне амэрыканскай стужкай «300 спартанцаў». Іранскага кіраўніка Ахмадынэжада зразумець можна. Пэрсы ў фільме паказаныя пякельнымі пачварамі, а з экрану гучаць заклікі да свабоды й дэмакратыі.

Але гаворка ў стужцы «300 спартанцаў» ідзе пра вельмі старую вайну.

У 480 г. да н.э. Пэрсыдзкая імпэрыя напала на Грэцыю. 300 спартанцаў у Тэрмапільскай цясьніне стрымлівалі аграмадную армію цара Ксэркса. Супраціў працягваўся, пакуль здраднік Эфіяльт не правёў пэрсаў у тыл абароны. Усе спартанцы на чале з царом Леанідам загінулі, але гераічны спартанскі чын стаўся пачаткам вызваленьня Грэцыі ад захопнікаў.

Карціну пра былыя падзеі вельмі цёпла прынялі сучасныя нашчадкі спартанцаў. Як сказала прадстаўніца губэрні Ляконія Бэці Каліяку, «фільм паказаў Спарту ва ўсёй ейнай велічы».

Затое гісторыкі паціскаюць плячыма. Спартанцы жылі ў дзяржаве сацыяльна-расавага апартэіду й трэніраваліся, палюючы на рабоў. Гісторык Эфраім Літл лічыць непрымальным, што спартанцы паказаныя ў фільме маральнымі — дакумэнтальна не было зафіксавана, колькі ваяроў было ў Тэрмапільскай цясьніне. Але гісторык ня ўзгадвае, што ў стужцы шчэ дзейнічаюць тролі, аграмадныя насарогі, магі, узброеныя бомбамі, і каты з клюшнямі замест рук.

У Эўропе й Штатах карціна б'е рэкорды. Квіткі раскупленыя цалкам, а ў менскіх кінатэатрах немагчыма патрапіць на сэанс.

Фільм — экранізацыя коміксу Фрэнка Мілера, бацькі «Рабакопу» й «Гораду грахоў». Адпаведна з коміксам — падкрэсьленая ўмоўнасьць колераў і герояў: шэрае неба, чырвоныя накідкі, счарнелы воўк, кроплі крыві ў рапідзе — і цялесныя дэталі скуры. Хрумст чырвонага яблыка перагукаецца са стогнамі захопнікаў, адсечаная галава ўзьлятае ў паветра, на пэрсыдзкім бізуне можна разглядзець кожны вузельчык.

Цар Леанід абараняе свабоду (і сваю гетэрасэксуальнасьць), цар Ксэркс разбудоўвае імпэрыю і патурае жаданьням (абодва пункты выклікалі ў Іране шок; у іранскай гістарычнай міталёгіі Ксэркс — як для беларусаў Усяслаў Чарадзей).

Карціна «300 спартанцаў» прапануе новы эпас — на падставе коміксу. Гэты эпас умоўны, натуралістычны, плякатны, кампутарны й зразумелы самай шырокай аўдыторыі. Ксэркс разгромлены. Кіно выйграла.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**ПЭРСАНАЖ** (Stranger Than Fiction)

Драма, ЗША, 2006, рэж. **Марк Форстэр**

Аднойчы падатковы інспэктар Гаральд Крык чуе голас, які камэнтуе ўсе ягоныя дзеяньні. І гэта не шызафрэнія. Проста схільная да суіцыду пісьменьніца піша пра Гаральда кнігу — і неўзабаве плянуе яго забіць...

Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08






## зьбяры кнігарню «Наша Ніва»

**Пётра Рудкоўскі.** Паўстаньне Беларусі.
**Анталёгія** «Жанчыны выходзяць з-пад кантролю».
**Андрэй Хадановіч.** Сто лі100ў на tut.by.
**Сямён Печанко.** У Беларускім войску.
**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко.** Беларусь за 10 падарожжаў.




УЖО Ў ПРОДАЖЫ













# Новы праект «Гуды»

Дыскаграфія. **Старонка 24.**



## Боршч

І ў пост і на хрост. Кухарыць Сяргей Харэўскі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК

**Шукаем дзетак!** Тэрмінова (сакавік–красавік) шукаем дзетак–дашкалят для стварэньня беларускай групы зь верасьня на захадзе Менску (раёны Чырвоны Бор — Сухарава — Захад), магчыма, ясельная і садаўская рознаўзроставая групы. Далучайцеся! З намі можна зьвязацца па тэл. 183–84–19, Лебедзі. Lebiedz@tut.by

### ВІТАНЬНІ

**Усіх чытачоў** і Рэдакцыю «Нашай Нівы» віншую з Днём Волі! Жыве Незалежная Беларусь! Жыве вечна! Усяслаў Церашковіч

**Зьміцер Дашкевіч**, мацуйся. Мы пераможам! Адкрыцьцё 21:7. Брат

### КАНТАКТЫ

**Памятай аб 37-м!** 2007–ы — год памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў XX стагодзьдзя. 29–га кожнага месяца запальваем сьвечкі памяці ў месцах масавых расстрэлаў. 29 сакавіка а 17.00 у Менску зьбіраемся ў трох месцах: У Курапатах, у Лошчыцкім парку, у парку Чалюскінцаў (Ваньковіцкім лесе)

**Аргкамітэт па ўшанаваньні памяці** ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Кантакты: 613–60–87. office@dyjaryush.org.by, represii@bchd.info, http://represii.bchd.info

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў сяброўскае падарожжа, 1 красавіка — «Замкі Беларусі» : Менск—Ліда—Ліпнішкі—Уселюб—Наваградак—Любча—Шчорсы—Мір. 8 красавіка — «Палацы і сьвятыні»: Ішкальдзь—Вольна—Сталовічы—Косава—Ружаны—Сынковічы—Слонім—Жыровічы. 15—17 красавіка: Уроцлаў—Сьвідніца—Явар—Ксёнж. 29—30 красавіка: Вільня—Меднікі—Трокі. Кантакты: GSM 622–57–20, 509–12–16, 110–19–28, 573–88–17, 017–292–54–58

### КНІГІ

**Дапамагу знайсьці** «Энцыклапедыю ВКЛ»: 241–18–18 (Ільля)

**Шукаю кнігі** тэрмінова: «150 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі», М.Ермаловіч «Беларуская дзяржава — Вялікае княства Літоўскае», У.Арлоў «Пяць мужчын у лесьнічоўцы», «Каханак яе Вялікасьці», В.Быкаў «Доўгая дарога дадому», В.Быкаў «Выбраныя творы» («Беларускі кнігазбор»). Т.: 8–029–837–26–83 (Зьміцер), e–mail: lucicz@yandex.ru

**Прадам** аповесьць Васіля Быкава «Бліндаж». Т. 639–23–14

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Гасудраственай думе.** Засяданьне 27 марца. Адкрываючы засяданьне, прадсядацель Думы абʼявіў, што дэпутата ад Ковенскай губ. Антона Купстаса (сацыял-дэмакрат) уласьці ковенскія прыцягнулі к суду, як палітычнага праступніка, па 129 стацьці. Пасьля гэтага Дума апошні раз прыступіла да разбору гасудраственага бюджэту.

**«Наша Ніва». №14.1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 15.**

Дырэкцыя ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» даводзіць да ведама акцыянераў, што выплата дывідэндаў за II паўгодзьдзе 2006 году будзе адбывацца 4, 5, 6 красавіка 2007 г па адрасе: г. Менск, вул. Сьлясарная, 48.

Акцыянэрам, якія пражываюць у Менскім і Лагойскім раёнах, — праз аддзяленьні ААБ «Беларусбанк» па месцы жыхарства.

Даведкі па тэлефоне: 294–34–18

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2241. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 14.03.2007.
Замова № 1734.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.